№№39–40
(2767–2768)

14 сакавіка 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

БЛІЦ

Якія дзеянні павінны быць з боку апазіцыі, калі ў склад выбарчых камісій не будуць уключаны прадстаўнікі аб'яднаных дэмакратычных сіл?

Мікалай МІКЕКА, юрыст:

— Я не ўдзельнічаю ў такіх выбарах і галасаваць не пайду. І ў апазіцыі павінен быць толькі адзін шлях — байкот выбараў.

Людміла ГРАЗНОВА, член Аб'яднанай грамадзянскай партыі:

— У гэтым выпадку адзіны разумны крок — зняцца з выбарчай дыстанцыі.

Анатоль БУКАС, рэдактар газеты "Борисовские новости":

— Увогуле я параіў бы адмовіцца ад удзелу ў выбарчай кампаніі пры такой сітуацыі. Без прадстаўніцтва дэмсіл у складзе камісій на выбарах няма чаго рабіць. Па-першае, гэта верны шлях да фальсіфікацый, калі бюлетэні можна папросту замяніць. Па-другое, ніхто не будзе ведаць рэальных лічбаў. У нас так было на мінулых выбарах — нашыя журналісты патэлефанавалі ў акружную выбарчую камісію, а там сказалі, што старшыня камісіі павёз іх у Мінаблвыканкам. Так што мы тыя лічбы нават у газеце не надрукавалі.

Васіль ШЛЫНДЗІКАЎ, эканаміст:

— Калі так усё і будзе, то лепшае, што могуць зрабіць апазіцыянеры — сысці з выбарчай дыстанцыі. Бо можна колькі заўгодна педаліраваць тэму фальсіфікацый, звяртацца да міжнароднай грамадскасці, але гэта нічога не зменіць. Браць удзел у выбарах без выбару — бессэнсоўна. Адзіны плюс ад удзелу ў выбарчай кампаніі — выкарыстанне легальнай магчымасці для агітацыі, а так... Больш нічога карыснага.

Алег ТЫЧЫНА, прадпрымальнік, жыхар г.Лепеля:

— Я сам неаднаразова спрабаваў балатавацца ў дэпутаты, а зараз ужо такога жадання няма. Я думаю, што ўлады ўжо маюць гатовыя спісы кандыдатаў па ўсіх выбарчых акругах краіны, якія ўрэшце і стануць дэпутатамі. Што можа зрабіць у гэтай сітуацыі апазіцыя? За тры дні да выбараў усе дэмакратычныя кандыдаты павінны зняць свае кандыдатуры. Я падкрэсліваю — УСЕ. Толькі гэтым можна паказаць усёй краіне, усяму свету, што выбары ў Беларусі прайшлі фактычна на безальтэрнатыўнай аснове, а значыць, недэмакратычна. Аднак хутчэй за ўсё здарыцца, як заўжды: адны здымуцца, а іншыя "пойдуць да канца". І гэтым толькі прыдадуць легітымнасць так званым выбарам.

Зінаіда КУРГАН, пенсіянерка:

— А мне ўсё роўна. На выбары я не хаджу. У пенсіянера пры цяперашнім жыцці толькі адзін клопат, каб на хлеб з малаком хапіла...

Валерый ДРАНЧУК, эколаг:

— Добра, што "Народная воля" ўжо зараз уздымае гэтае пытанне. На маю думку, шлях у апазіцыі толькі адзін — байкот і толькі байкот. Да гэтага трэба рыхтавацца. У дадзеным выпадку байкот — гэта сродак змагання, сродак барацьбы. І ў выпадку, калі ў выбарчых камісіях не будзе прадстаўнікоў АДС, байкот — вельмі слушны крок. І да яго рыхтаваць людзей трэба ўжо зараз.

Апытанне праводзіў Віталь ГАРБУЗАЎ.

ЗВАРОТ ДА БЕЛАРУСКАЙ ГРАМАДСКАСЦІ

Паважаныя людзі Беларусі!

25 сакавіка споўніцца два гады з таго дня, як быў зняволены старшыня БСДП, былы кандыдат на пасаду прэзідэнта Беларусі Аляксандр Казулін.

Ад імя Прэзідыума БСДП заклікаю вас правесці акцыі салідарнасці з А.Казуліным.

Акцыі могуць быць розныя: мітынгі, пікеты, пасылка А.Казуліну лістоў і паштовак.

Заяўкі ўстаноўленай формы на правядзенне мітынгаў і пікетаў трэба падаць у гарадскія і раённыя выканаўчыя камітэты.

Лісты і паштоўкі трэба накіроўваць на адрас: 211300 Віцебскі раён, пас.Віцьба, ПК-3 (Витебский район, пос.Витьба, ИК-3).

З павагаю —

Анатоль ЛЯЎКОВІЧ, першы намеснік старшыні БСДП.

Браты Скрабцы аб'явілі бестэрміновую галадоўку

Дзесятага сакавіка былы дэпутат Палаты прадстаўнікоў Сяргей Скрабец і яго брат Аляксандр абвясцілі бестэрміновую галадоўку з патрабаваннем тэрміновага вызвалення палітзняволеных — экс-кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Казуліна, прадпрымальніка Сяргея Парсюкевіча і маладзёжнага актывіста Андрэя Кіма.

Па меркаванні Сяргея Скрабца, галадоўка павінна прыцягнуць увагу беларускага грамадства да сітуацыі з парушэннем правоў чалавека ў Беларусі: *"Чаму ЗША і Еўропа пастаянна змагаюцца з парушэннем правоў чалавека, а беларусы пры гэтым маўчаць? Няўжо ўсіх такая сітуацыя задавальняе? Чаму мы, беларусы, павінны маўчаць?"*

У першую чаргу галадоўшчыкі патрабуюць тэрміновага і безумоўнага вызвалення Аляксандра Казуліна. Хаця сам экс-кандыдат пра галадоўку братоў Скрабцоў не ведае: *"Ні ў якім разе Казулін не прасіў нас галадаць,* — гаворыць Сяргей Скрабец. — *Наадварот, падчас яго прабывання на волі на пахаванні жонкі я быў адным з многіх, хто адгаворваў яго галадаць у калоніі. Мне ў гэтым сэнсе прасцей, я не ў турме".*

Сяргей Скрабец выказвае спадзяванне, што галадоўка дасць плён: *"Калі памятаеце, я галадаў, калі яшчэ быў дэпутатам,* — працягвае Скрабец. — *Тады мы разам з Валерыем Фраловым і Уладзімірам Парфяновічам дамагаліся вынясення пытання аб змяненні выбарчага заканадаўства. І тады мы дамагліся свайго. Потым я цягам сарака дзён галадаў у турме, дамагаючыся ўмоўна-датэрміновага вызвалення. І зноў дабіўся гэтага. На маю думку, галадоўка — гэта вельмі дзейсны інструмент барацьбы. Канечне, гэта небяспечна для здароўя, але іншага шляху ў нас зараз проста няма".*

На другі дзень акцыі браты Скрабцы накіравалі ліст новаабранаму прэзідэнту Расіі Дзмітрыю Мядзведзеву, у якім падрабязна распавялі пра парушэнні правоў чалавека ў Беларусі і пра сітуацыю з палітзняволенымі ў нашай краіне. *"Увесь свет павінен быць салідарным, асуджаючы гэткія праявы ў цэнтры Еўропы",* — кажуць Скрабцы.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Зміцер Дашкевіч стаў ардэнаносцам

Нядаўна ў Таліне прайшоў кангрэс новай дыяспары Еўропы і ЗША, з удзелам прадстаўнікоў дэмакратычных сіл Беларусі. У ім узялі ўдзел дэлегаты больш як з 25 розных арганізацый, партый, груп.

Прысутнічалі таксама прадстаўнікі старэйшага пакалення беларускай дыяспары — Зянон Пазьняк, Алесь Шатэрнік і Якуб Гутман.

Удзельнікі кангрэсу вызначылі прадметны план дзеянняў у сферы інфармацыйнай працы, абароны беларускіх дэмакратычных сіл, прасоўвання беларускай культуры ў сваіх краінах. Мяркуецца, што падобны кангрэс стане штогадовым.

Там жа, у Таліне, прайшла ўрачыстасць, звязаная з узнагароджаннем былога палітвязня, лідэра незарэгістраванага "Маладога фронту" Зміцера Дашкевіча ордэнам Свабоды імя Кастуся Каліноўскага, зробленага вядомым скульптарам Алесем Шатэрнікам. "Ордэн выраблены з бронзы ў адзіным асобніку, — распавёў "Народнай волі" Алесь Шатэрнік. — Яго дыяметр восем сантыметраў. На адным баку выява Кастуся Каліноўскага, узятая са знакамітага малюнка з датай паўстання 1863 года, а на іншым баку надпіс: "Жыві ў свабодзе".

Плануецца, што ўручэнне падобнага ордэна будзе рэгулярным.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

КАМЕРТОН

от Сергея Ваганова

РосКЭШные люди

Эту рекламную фразу я увидел в самом центре Минска, на торцовой стене дома, где испокон веку теснится Центральный книжный магазин. На большом щите, почему-то расположенном, вопреки всем рекламным правилам, не на виду, красовалось: "ВРЕМЯ РОСКОШНЫХ ЛЮДЕЙ!"

Между тем время было вечернее, по широкому тротуару в обе стороны двигался разнообразный прохожий люд. Я присмотрелся — хоть кто-нибудь остановится, кому-нибудь еще бросится в глаза это оптимистичное утверждение? Потом понял: я и сам-то заметил его только потому, что давно не был в этом уголке города.

Многое удивило меня в этом, с детства знакомом, уголке. Но более всего арка, за которой, помню, мерещилась тайна большого двора, где жили твои друзья, первая любовь — каждая школьная любовь остается в памяти первой... Я всмотрелся, потом вслушался в своды — они хранили молчание, только хлопанье крыльев и сытое воркование голубей...

Арка была перегорожена шлагбаумом, а стены увешаны знаками, запрещающими остановку и въезд.

Зря, подумал, ты тут остановился. Не твое это время, реклама права...

А шел я, надо сказать, на встречу с одноклассниками из 42-й школы, той, что метрах в ста от проспекта, если свернуть с него за угол книжного и пройти по Комсомольской улице вниз. Школы, кстати, нынче знаменитой тем, что когда-то, еще раньше нас, ее окончил Нобелевский лауреат Жорес Алферов. "Еще раньше" — потому что мы сами окончили ее ровно пятьдесят лет назад.

Не буду занимать ваше внимание описанием чувств и трогательных подробностей встречи. Скажу только, что знаменитостями наш класс не отличился. Но все прожили СВОЕ ВРЕМЯ достойно — в основном в медицине, музыке, науке и разных инженерных областях. Даже те, которые спились и умерли, или умерли от нормальных болезней, так и не дожив до "времени роскошных людей".

Нет, не давала мне покоя эта бесстыжая фраза.

Я сказал о ней Юре. Он усмехнулся, мы, конечно, разговорились — что да как... Оказывается, он всю жизнь, с дошкольных еще лет, мечтал научиться играть на аккордеоне. И вот только сейчас, выйдя на пенсию, разучивает "Чардаш" Монти, а любимые с детства "Скалистые горы" уже разучил. Я спросил, хватает ли ему пенсии? Он сказал, что жена запретила ему об этом думать. Жена — врач...

После той встречи я все-таки решил найти "роскошных людей". И пошел по адресу, указанному на щите. Адрес, собственно, и был единственным конкретным элементом рекламы, в общем, неведомо чего. Интрига!

Минут сорок я простоял возле неказистого снаружи магазинчика. Но никто не зашел туда и оттуда не вышел.

Сам я зашел, сказавшись покупателем портмоне. Выдержав настороженный взгляд охранника, я постоял возле стойки, за стеклом красовались портмоне, зажигалки, авторучки... Все фирменное, дорогущее, но, в общем, не настолько, чтобы при острейшем, от смерти, желании не купить. Ну, полтора миллиона за ручку, миллион за портмоне... Три с небольшим Юриных пенсии, две с небольшим зарплаты его жены.

Дешев, однако, у нас в Беларуси проход в "роскошные люди".

Почему-то вспомнилось модное словечко "кэш". С английского — "тайный запас". РосКЭШные люди...

Откуда взялись они в стране с "неразбазаренной государственной собственностью"? И почему так уверены, что оседлали Время и подчинили "не роскошных" людей, от крестьян до трудящихся бизнесменов, которые тащат на себе эту страну с неподъемной экономикой и тяжким грузом советского прошлого в невнятное будущее?

Я вернулся к тому проходу, к той арке, к тому шлагбауму, разделившему времена. Изредка шлагбаум поднимался и, качнувшись, быстро опускался за проплывшим солидным — тоже модное слово — авто. Вопреки запрету, стекла их были в тени, никого из "роскошных людей" я за ними так и не рассмотрел. Да и не рассматривал вовсе.

Я вернулся, чтобы поговорить со Стефанией Станютой, запечатленной в мемориальной доске по левую сторону арки. Я вспомнил посвящение ей, которое, по праву человека, одаренного ею не театральной — простой человеческой дружбой, написал, когда на сломе веков она умерла.

"В 70-х, — вспоминал я в том посвящении, — мы жили с ней в одном доме, на одном этаже, дверь в дверь. Потом она переехала в другой дом. Этаж опустел.

Опустел этаж, на котором она жила рядом с нами и который называется XX век. Мы, конечно, переберемся, вскарабкаемся на новый. Но поднимемся ли?.. Освоим ли высоту Духа, которую явили нам — нет, не свидетели — творцы Века?!".

Вглядываясь в застывший полупрофиль, я спрашивал у великой актрисы, как она чувствует себя в окружении вызывающе ярких запретительных знаков и нагловатой рекламы? Помня ее роскошное умение безоглядно радоваться жизни, не всегда легкой, и людям, не всегда хорошим, я догадывался, конечно, что она могла бы сказать в ответ: "Не берите до головы, Сережа. Век только начался. Все еще впереди..."

kamerton_41@mail.ru

ЧУЛІ?

472 беларусы могуць стаць неўязнымі ў Польшчу

Польская няўрадавая арганізацыя "Фонд Свабода і дэмакратыя" апублікавала рапарт па выніках даследаванняў палітычных рэпрэсій у Беларусі.

Дакумент перш за ўсё выклікае цікавасць тым, што ўтрымлівае спіс дзяржаўных чыноўнікаў, дзеячаў культуры, супрацоўнікаў КДБ, МУС і нават радавых міліцыянераў, якія, на думку аўтараў рапарту, спрычыніліся да парушэння правоў чалавека ў Беларусі.

Усяго ў спісе 472 прозвішчы. Тут імёны рэктараў амаль усіх беларускіх ВНУ, з якіх па палітычных матывах былі выключаны студэнты (У.Шымаў, П.Беспальчук, М.Батура і г.д.), амаль у поўным складзе трапіла ў спіс кіраўніцтва Адміністрацыі прэзідэнта (Г.Нявыглас, Н.Пяткевіч, А.Рубінаў...), пазначаны таксама беларускія міністры, супрацоўнікі АМАПа, КДБ і МУС розных упраўленняў, старшыні выбарчых камісій і нават людзі культуры: Валер Раеўскі, Аляксей Дудараў, Барыс Луцэнка і іншыя. Супраць кожнага прозвішча — тлумачэнне, у якіх парушэннях абвінавачваецца асоба. Спіс апублікаваны на інтэрнет-старонцы http://wid.org.pl/raport.pdf.

Даследчыкі палітычных рэпрэсій у Беларусі маюць намер звярнуцца да Міністэрства ўнутраных спраў Польшчы з просьбай забараніць пазначаным у рапарце беларусам уезд на тэрыторыю Польшчы.

— Працэдура гэтая доўгая, — кажа былы першы сакратар польскай амбасады ў Мінску, супрацоўнік "Фонду Свабода і дэмакратыя" Марэк Буцька. — Зразумела, што толькі на выснове нашага даследавання МУС Польшчы не зацвердзіць спіс неўязных беларускіх чыноўнікаў. Абавязкова будзе праведзена нейкая дадатковая ўдакладняючая праца.

Акрамя таго, шмат у чым рашэнне МУС будзе залежаць ад агульнай палітыкі Польшчы. Сёння ў кіруючую кааліцыю Польшчы ўваходзіць таксама Сялянская партыя, лідэры якой заклікаюць сябраваць з беларускім рэжымам. Праўда, гэтая партыя знаходзіцца ў меншасці і, трэба спадзявацца, не будзе ўплываць на агульнае рашэнне ўрада.

— Марэк, як узнікла ідэя складзі гэты спіс?

— Ідэя вынікае і з польскай рэчаіснасці ў тым ліку. Мы назіралі, як у Польшчы літаральна праз год-два людзі забываліся пра імёны тых, хто ў судзіў, збіваў на акцыях, звальняў з працы. Так і ў Беларусі. Падобны спіс у нейкім сэнсе будзе гістарычным дакументам. Трэба, каб людзі ведалі і разумелі, што яны адказныя за кожны свой учынак. Ні ўлада, на якую можна спісаць свае дзеянні, ні абставіны, а менавіта ты сам. І ты павінен за гэта адказваць.

Акрамя таго, дадзены спіс далёка не поўны. Думаю, што ў спіс увайшло толькі 20 працэнтаў ад агульнай лічбы тых, хто парушаў правы чалавека на Беларусі. Спіс на працягу года будзе папаўняцца. Мы перакладзём яго на англійскую мову і будзем прапанаваць краінам ЕС таксама забараніць "дзеючым беларускім асобам" уезд на тэрыторыю іх дзяржаў.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

Прэферэнцый не відаць

Еўрапейскі Саюз не збіраецца вяртаць Беларусі гандлёвыя прэферэнцыі ў 2008 годзе. Гэта стала вядома ў ходзе пасяджэння дзелавога Савета Беларусь—ЕС у Мінску.

Беларусь не зможа вярнуць у 2009 годзе гандлёвыя прэферэнцыі, якіх афіцыйны Мінск быў пазбаўлены ў 2007 годзе за парушэнні правоў прафсаюзаў. Пра гэта па выніках пасяджэння дзелавога Савета Беларусь—ЕС заявіў намеснік міністра замежных спраў Беларусі Андрэй Еўдачэнка. Нават калі ўсе краіны-ўдзельніцы ЕС выступяць за вяртанне Беларусі прэферэнцый, сама працэдура вельмі працяглая.

Зачыніў дзверы і падпаліў

Нетрадыцыйным чынам вырашыў "разлічыцца" са сваёй суседкай 64-гадовы жыхар вёскі Купмяны, што ў Астравецкім раёне.

Ён зачыніў яе ў хаце і падпаліў. Як паведамляе прэс-служба ўпраўлення ўнутраных спраў Гродзенскага аблвыканкама, гэты выпадак адбываўся сярод белага дня і гэта чамусьці вельмі здзівіла мясцовых міліцыянтаў.

Падчас падпалу амаль згарэла летняя кухня і пачала гарэць хата. Аднак жанчыну паспелі выратаваць. Яе крыўдзіцель быў затрыманы.

Міліцыя шукае, але беспаспяхова

У Гродне невядомы за адзін вечар разбіў вокны ў васьмі аўтамабілях. Міліцыя яго шукае, але пакуль беспаспяхова.

Невядомы пачаў свой шлях з вуліцы Рэпіна, разбіваючы вокны пярэдніх дзвярэй прыпаркаваных аўтамабіляў. Спачатку пацярпелі 5 легкавікоў гродзенскіх будаўнікоў, што жывуць у мясцовым інтэрнаце.

Пасля шлях маладога хуліга на працягнуўся па вуліцы Паповіча, дзе падобным чынам былі разбітыя вокны яшчэ трох аўтамабіляў. Цяпер вядзецца следства, і па фотаробаце шукаюць злачынцу, паведамляе прэс-служба УУС Гродзенскага аблвыканкама.

НУ І НУ!

Новая тактыка?

Намесніку старшыні Гродзенскай гарадской суполкі Партыі БНФ Максіму Губарэвічу невядомыя пагражаюць фізічнай расправай.

Днямі ў краме да Максіма Губарэвіча падышлі двое мужчын і папярэдзілі, што ў выпадку ўдзелу ў несанкцыянаваных мерапрыемствах ён будзе мець вялікія праблемы. У прыватнасці, адзін з незнаёмцаў пагрозліва паведаміў, што разаб'е апазіцыянеру акуляры. Максім Губарэвіч не выключае, што такім чынам прадстаўнікі сілавых структур спрабуюць яго запалохаць напярэдадні 25 сакавіка.

— Раней мне пагражалі людзі ў міліцэйскай форме, а цяпер пагрозы зыходзяць ад людзей у цывільным. Цалкам верагодна, што такім чынам сілавыя структуры спрабуюць абмежаваць удзел актыўных людзей у несанкцыянаваных мерапрыемствах.

На працягу года Максім Губарэвіч двойчы адбываў тэрміны адміністрацыйнага арышту за сваю грамадскую дзейнасць, а летам мінулага года атрымаў штраф у памеры 10 базавых велічынь за ўдзел у абароне старажытнай часткі горада ад руйнавання.

Народная Воля http://www.nv-online.info
14 САКАВІКА 2008 г.

Што хаваецца за «далікатнасцю» міністра Уладзіміра Навумава

Падобна на тое, што міністр унутраных спраў Беларусі Уладзімір Навумаў цалкам не згодны з былым міністрам юстыцыі Расійскай Федэрацыі Паўлам Крашаніннікавым, на думку якога *"ў турме павінна быць менш турмы"*. Адказваючы на пытанне аднаго з журналістаў пра санітарны стан турмаў, дзе адбываюць тэрмін пакарання адміністрацыйна арыштаваныя (у прыватнасці, у г. Уздз), сп. Навумаў заявіў: **"Не думаю, што трэба даводзіць гэтыя месцы да такога стану, каб туды камусьці хацелася"**.

Калі адкінуць "далікатнасць" міністэрскага мыслення ў бок і перакласці яго выказванне на агульназразумелую мову, то атрымаецца прыкладна наступнае: чым горшыя (гэта значыць больш жорсткія, нецывілізаваныя) умовы ўтрымання адміністрацыйна асуджаных, тым лепш яны падыходзяць для іх перавыхавання.

Менавіта на такім прынцыпе (цынічным па сутнасці) грунтуецца пенітэнцыярная сістэма Беларусі, лічыць адзін з лідэраў прадпрымальніцкага руху, сябра Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) **Віктар Крываль**. За арганізацыю акцыі пратэсту прадпрымальнікаў на Кастрычніцкай плошчы Мінска 11 снежня 2007 года ён 15 сутак адбываў пакаранне ў так званым Цэнтры ізаляцыі правапарушальнікаў ГУУС Мінгарвыканкама (на Акрэсціна). У лютым яго зноў пасадзілі на такі ж тэрмін, на гэты раз за тое, што ён быццам бы распаўсюджваў на Уздзенскім базары ўлёткі з заклікам да ўдзелу ў несанкцыянаваным мерапрыемстве. Пакаранне палітыку давялося адбываць у мясцовай уздзенскай турме. Абодва разы ён трымаў галадоўку. Жорсткія ўмовы ўтрымання ў уздзенскім ізалятары прывялі да таго, што стан здароўя сп.Крываля рэзка пагоршыўся, таму па рэкамендацыі доктара міліцыя мусіла вызваліць яго на два дні раней заканчэння тэрміну зняволення.

"На маю думку, — гаворыць сп. Крываль, — *сучасная сістэма ўтрымання палітвязняў у нашай краіне спецыяльна будуецца так, каб прынізіць іх, дэмаралізаваць, зламаць іх волю да далейшых палітычных дзеянняў. Прычыненне палітычнаму праціўніку фізічных пакут у турме — гэта частка ўладнай тэхналогіі падаўлення апазіцыі. З дапамогай жудасных умоў утрымання за кратамі чалавеку спрабуюць унушыць, быццам ён толькі ўмоўна чалавек, а яго сапраўднае вызначэнне — вош дрыжачая, якую "гаспадары жыцця" ў любы момант могуць раздушыць. Гэта падобна на тое, як ставілася да ерэтыкаў сярэднявечная інквізіцыя."*

Віктар Крываль распавёў аб тым, з якімі дзікімі рэчамі сутыкнуўся ён і яго таварышы падчас знаходжання ў ізалятары па вул.Акрэсціна. У тыя дні, калі ён адбываў пакаранне, туды паступіла жанчына з сумніўным мінулым. Нягледзячы на гэта, ёй даручаюць раздаваць ежу, хоць па ўсіх правілах да мыцця пасуды і раздачы ежы адміністрацыйна арыштаваныя і блізка не павінны дапускацца. *"Што тычыцца ўмоў утрымання ў камерах, то тут увогуле жах! Шыбы ў акенцах разбітыя, у памяшканні гуляе вецер, тэмпература блізкая да тэмпературы на вуліцы, смурод, паўцемра, бегаюць пацукі. І перанаселенасць, якую цяжка ўявіць. Праўда, у адрозненне ад Мінска, ва Уздзе мяне трымалі ў адзіночцы, аднак што тычыцца тэмпературы і асвятлення, то ў райцэнтры яшчэ горш".*

У заяве на імя начальніка Цэнтра ізаляцыі правапарушальнікаў Мінгарвыканкама сп.Крываль запатрабаваў адмяніць *"здзеклівыя ўмовы ўтрымання арыштаваных"*. У прыватнасці, ён запатрабаваў гарантый (у тым ліку і дакументальных) таго, што да раздачы ежы арыштаваным не будуць мець дачынення асобы, якія не прайшлі адпаведнага медыцынскага абследавання. Ён таксама запатрабаваў наладзіць у камерах прымальны тэмпературны і светавы рэжым, дазволіць арыштаваным атрымліваць перадачы.

Як ні дзіўна, палітык атрымаў пісьмовы адказ на сваю заяву ад начальніка Рэспубліканскай санітарна-эпідэміялагічнай службы МУС РБ **А.Жука**. З яго вынікае, што раздача ежы адміністрацыйна арыштаванымі асобамі, не прайшоўшымі медагляд (да таго ж з ліку арыштаваных), *"катэгарычна забаронена"*, для гэтага існуюць сёстры-гаспадыні.

"Калі так, — разважае сп. Крываль, — *то ўзнікае пытанне, чаму да раздачы ежы была прыцягнута асоба з ліку арыштаваных?"*

З ліста сп. Жука вынікае, што яго служба не супраць перадач, у лістападзе 2006 года яна нават узгадніла спіс прадуктаў, якія можна перадаваць. Вось толькі працэсуальна-выканаўчы Кодэкс РБ *"забараняе прадуктовыя перадачы"*. Таму, маўляў, усе пытанні да яго, "бессардэчнага".

Але, канечне, сп.Жук не быў бы падначаленым сп.Навумава, каб не запэўніў сп.Крываля і ўсіх, каго хвалююць умовы ўтрымання людзей у ізалятарах, што нельга губляць аптымізм, бо ўсё лепшае і светлае — напярэдзе. Паведаміў аб тым, што *"плануецца расшырэнне аконных праёмаў у камерах, усталяванне ложкаў, сталоў, слончыкаў, тумбачак, столевых свяцільнікаў. Прадугледжана выдача адміністрацыйна арыштаваным пасцельных рэчаў"*. Адным словам, чакай паляпшэння ўмоў утрымання арыштаваных, калі на гары рак свісне.

Яшчэ спадар Жук запэўніў: *"У выпадку выяўлення фактаў, указаных у вашым звароце, будуць прымацца самыя жорсткія меры да вінаватых"*. Але ж, мяркуючы па фактах, чакаць навядзення ў ізалятарах адпаведнага санітарнага парадку, відаць, прыйдзецца доўга.

А пакуль міністр Навумаў на згаданай прэс-канферэнцыі параіў журналістам самім наведаць уздзенскі ізалятар, каб усё пабачыць на свае вочы. Сп. Крываль таксама падтрымлівае гэту ідэю, больш таго, ён прапануе наведаць мясцовую турму і спадару Навумаву. І пацікавіцца ўмовамі ўтрымання арыштаваных не толькі ва Уздзе, але і ва ўсіх адпаведных установах па ўсёй краіне. Пасля гэтага, можа, *у беларускіх турмах будзе менш турмы.*

Вячаслаў ОРГІШ.

У ТЭМУ

Маладзёжныя актывісты заклікалі кіраўніка офіса АБСЕ Ханса-Ёхана Шміта наведаць у турме Андрэя Кіма. Пра гэта паведаміў намеснік старшыні маладзёжнага аб'яднання АГП "Маладыя дэмакраты" Міхаіл Пашкевіч.

Паводле яго слоў, сустрэча прадстаўнікоў "Маладых дэмакратаў" і лідэра АГП Анатоля Лябедзькі з кіраўніком офіса АБСЕ ў Мінску адбылася на мінулым тыдні. Падставай да сустрэчы паслужыў пісьмовы зварот у офіс АБСЕ Анатоля Лябедзькі ў сувязі са стварэннем у Беларусі спісу палітневыязных.

"Мы перадалі паслу зварот ад міжнароднай грамадскасці з інфармацыяй па крымінальнай справе, распачатай у дачыненні да маладзёжных актывістаў па факце масавых беспарадкаў у Мінску падчас акцыі пратэсту індывідуальных прадпрымальнікаў 10 студзеня. Спадар Шміт нас запэўніў у тым, што высновы ён мае намер рабіць з тых фактаў, якія бачыў на свае вочы, не засноўваючыся на меркаванні апазіцыі або ўлады. Таму мы і папрасілі яго наведаць А.Кіма ў турме, каб на свае вочы ўбачыць, у якіх умовах утрымліваецца малады чалавек", — сказаў М.Пашкевіч.

Таксама ўдзельнікі сустрэчы запрасілі Ханса-Ёхана Шміта на працэсы, якія ў хуткім часе павінны прайсці над заяўнікамі "Еўрапейскага Маршу" і над удзельнікамі акцыі пратэсту прадпрымальнікаў.

Нагадаем, у акцыі пратэсту прадпрымальнікаў 10 студзеня ўзялі ўдзел больш як тры тысячы чалавек, 27 былі затрыманы і 23 — асуджаны. Па гэтым факце распачата крымінальная справа па ч. 1 арт. 342 Крымінальнага кодэкса (арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, або актыўны ўдзел у іх). У якасці абвінавачаных па ёй праходзяць 14 чалавек. Сярод іх — А.Кім, у дачыненні да якога ўжо была распачата крымінальная справа на падставе артыкула 364 Крымінальнага кодэкса (насілле або пагроза насілля ў дачыненні да супрацоўніка міліцыі).

Трэцяя спроба

Прадстаўнікі ствараемага руху "За свабоду", на чале з Аляксандрам Мілінкевічам, у чарговы раз перадалі ў Міністэрства юстыцыі дакументы на рэгістрацыю.

Устаноўчы сход гэтай грамадскай арганізацыі адбыўся ў лютым у Магілеве.

Гэта ўжо трэцяя спроба руху афіцыйна зарэгістравацца. Раней ініцыятары праводзілі падобныя сходы ў Гродне і Мінскім раёне. Аднак абодва разы Міністэрства юстыцыі, спасылаючыся на розныя парушэнні, адмаўляла ім у рэгістрацыі. Рух "За свабоду", як і незарэгістраваны "Малады фронт", маюць усе шанцы ўвайсці ў Кнігу рэкордаў Гінеса па колькасці спроб легалізавацца.

Наталля Пяткевіч баіцца катацца на горных лыжах

Старшыня федэрацыі гарналыжнага спорту Наталля Пяткевіч баіцца катацца на горных лыжах. Пра гэта намесніца кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта паведаміла ў інтэрв'ю газеце "Спортивная панорама". *"Катацца на горных лыжах, шчыра кажучы, баюся, хоць я і адчайны чалавек. Гэта таму, што мала практыкі, часу на трэніроўкі не хапае",* — сказала Наталля Пяткевіч.

Памёр ад голаду

Калі гэтага пакутніка прывезлі ў Магілёўскі гарадскі шпіталь, ён выглядаў, як нябожчык. З жоўтым завастрыўшымся тварам. Але вочы яшчэ адкрываліся.

Бывае ж такое ў XXI стагоддзі! Ды не дзе-небудзь у адсталай афрыканскай краіне, а ў абласным беларускім горадзе Магілёве. "Хуткая" забрала няшчаснага з аднаго абсалютна ўбогага жылля ў прыватным сектары па вуліцы Калужскай. Урачы канстатавалі крайнюю ступень знясілення. Пацыент гадоў сарака прызнаўся, што нічога не еў тры дні, ды і да гэтага сілкаваўся больш як бедна, пішуць "Магілёўскія ведамасці".

Вывесці небараку з цяжкага стану ўрачам так і не атрымалася. Ён памёр у шпіталі праз некалькі гадзін пасля таго, як туды паступіў.

Беларускія лётчыкі загінулі ад чаду

У Калінінградзе знойдзены мёртвымі два лётчыкі авіякампаніі "КД-авія".

Паводле папярэдніх звестак, мужчыны атруціліся чадным газам з-за няправільнай эксплуатацыі газавай калонкі ў кватэры, якую яны здымалі. Пілоты мелі двайное грамадзянства — беларускае і расійскае.

КОММЕНТАРИЙ

Михаил ПАСТУХОВ:

«Конституция из важнейшего правового документа превратилась в маленькую книжечку, которую изучают разве что школьники и студенты юридических вузов»

15 марта — День Конституции Республики Беларусь.

Как отмечают этот праздник и какое значение он имеет для белорусов?

Ответить на этот вопрос "Народная воля" попросила профессора, экс-судью Конституционного суда Михаила Пастухова.

— В других странах день Конституции относится к числу важнейших государственных дат, — *говорит Михаил Иванович.* — Его чтят и уважают не только государственные деятели, но и простые граждане. И это не случайно, поскольку Конституция закрепляет основы государства, "дарует" гражданам всевозможные права и свободы. Государственные деятели должны быть благодарны Конституции хотя бы за то, что она позволила им занять соответствующее место в иерархии власти, а граждане — что они могут чувствовать себя полноправными хозяевами в своей стране, а не жалкими рабами. Но это в том случае, если Конституция действительно является реальной и все ее положения подлежат безусловному исполнению.

К сожалению, в нашей стране этот государственный праздник можно признать очень скромным. Представители власти как-то недооценивают наш Основной закон. Может быть, по той причине, что более близкой для них является не первоначальная Конституция, а "подправленная" на референдуме 1996 года. Именно этот вариант Конституции дал неограниченные полномочия президенту страны, но простые граждане не получили от нее практически ничего. Они вынуждены довольствоваться лишь теми "крохами", которые бросает им власть.

Не удивлюсь, если из десяти опрошенных на улицах граждан только один-два скажут, что 15 марта — государственный праздник. И, наверное, не найдется ни одного, кто будет "по полной программе" отмечать этот день.

— Как по-вашему, почему так происходит?

— Мне представляется, что власть не показывает примера уважительного отношения к Конституции, и самое главное — к закрепленным в ней правам и свободам граждан. Такое отношение порождает определенное равнодушие со стороны большинства белорусов к Основному закону страны. Еще одна причина забвения этого праздника в том, что Конституция перестала играть свою роль: из важнейшего правового документа она превратилась в маленькую книжечку, которую изучают разве что школьники и студенты юридических вузов.

Чтобы возродить значение Конституции, необходимо обеспечить в стране конституционную законность. Положения Конституции должны стать святыми для главы государства, всех государственных служащих, неуклонно исполняться на практике и не подменяться многочисленными нормативными актами.

Рекомендую читателям "Народной воли" обратить внимание 15 марта на содержание государственных газет, теле- и радиопередач — как они будут преподносить это событие.

— Не так давно был сформирован новый состав Конституционного суда. Как вы считаете, сможет ли он обеспечить верховенство Конституции в стране? Тем более что, напутствуя новых судей, А.Лукашенко сказал, что полномочия суда могут быть значительно расширены...

— В соответствии со статьей 79 Конституции, ее гарантом, а также гарантом прав и свобод граждан является президент страны. Другие органы власти к этому "священному делу" не допущены. Это обстоятельство не позволяет Конституционному суду открыто бороться за соблюдение конституционных положений. Они "защищают" Конституцию лишь с подачи иных субъектов — того же главы государства, палат парламента, правительства, что существенно снижает возможности в наведении конституционного порядка в стране.

Следует также признать, что полномочий у Конституционного суда явно недостаточно. Мне, например, непонятно, почему гражданам не дать право напрямую обращаться в Конституционный суд за защитой своих прав и свобод, если они нарушаются в актах законодательства?

Считаю, что Конституционный суд должен иметь также право официально толковать положения Конституции, чтобы сделать ее живым, постоянно развивающимся Законом.

Давно назрела необходимость поручить Конституционному суду принимать решения о конституционности формулировок вопросов, выносимых на республиканские референдумы. Это должно исключить сомнения в законности их проведения.

Конституционный суд может стоять на страже законности парламентских и президентских выборов. К нему могут обращаться с жалобами все обиженные кандидаты в депутаты и в президенты. И только Конституционный суд может объявлять итоги и выборов, и референдумов, неся всю полноту ответственности за их законность и объективность.

Все это в силах как новых судей Конституционного суда, так и главы государства. Как говорят, было бы желание. Тем более что белорусский народ ждет от власти позитивных шагов к признанию европейских ценностей.

— Что еще, на ваш взгляд, можно было бы сделать для того, чтобы светлое будущее пришло к нам скорее?

— Прежде всего надо показать хороший пример с проведением парламентских выборов. Необходимо обеспечить свободное участие в выборах всех демократических сил, широкое представительство в избирательных комиссиях политических партий, свободу предвыборной агитации, беспрепятственное наблюдение за ходом выборов и результатами голосования. Очень важно, чтобы эти выборы признали международные эксперты. Тогда к нам будет большее доверие со стороны европейских государств. Правда, это повлечет за собой другие позитивные последствия. Мы должны будем в большей степени заботиться о защите прав и свобод граждан, отказаться от сохраняющейся только в нашей стране смертной казни, ввести должность парламентского уполномоченного по правам человека, реформировать всю правоохранительную систему и в целом законодательства. В конце концов, пора жить по-европейски. Тогда перед нами будут открыты все пути.

Марина КОКТЫШ.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

«Белнафтахім»: *гісторыя з працягам*

Па просьбе "Народнай волі" эксперты Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў аналізуюць магчымыя наступствы амерыканскіх санкцый супраць "Белнафтахіма".

13 лістапада 2007 года ўпраўленне па кантролю замежных актываў Міністэрства фінансаў ЗША — ОФАК заблакіравала актывы канцэрна "Белнафтахім". Санкцыі супраць "Белнафтахіма" першапачаткова былі сустрэтыя ў Беларусі з доляй скептыцызму, і пераважна ўспрымаліся як іміджавая мера. Аднак магчымая дэталізацыя санкцый супраць падраздзяленняў канцэрна можа надаць развіццю падзей новую дынаміку.

Прававымі падставамі гэтых дзеянняў былі паўнамоцтвы, дадзеныя ОФАК ад прэзідэнта ЗША ў сувязі з выдадзеным ім 19 чэрвеня 2006 года дакументам, дзе падкрэслена, што выкарыстанне арганізацыямі і грамадзянамі, якія парушаюць дэмакратычныя прынцыпы ў Беларусі, пэўных фінансавых актываў стварае надзвычайную і выключную пагрозу дзяржаўнай бяспецы і знешняй палітыцы ЗША. Міністэрства замежных спраў Беларусі ў сваёй заяве падкрэсліла, што ЗША парушыла свае абавязацельствы паводле Мемарандуму аб гарантыях бяспекі ў сувязі з далучэннем Беларусі да дамовы пра нераспаўсюджванне ядзернай зброі ад 5 снежня 1994 года, у якой абяцалі не карыстацца мерамі эканамічнага прымусу дзеля падначалення Беларусі інтарэсам ЗША. МЗС абвінаваціў ЗША таксама ў парушэнні пагаднення паміж Беларуссю і ЗША пра гандлёвыя дачыненні, паводле якога ЗША абавязаліся паляпшаць доступ беларускіх тавараў і паслуг на свой рынак.

Калі нейкая структура трапляе ў спіс блакіраваных, з таго вынікае, што ніводны амерыканскі грамадзянін, арганізацыя, якая ўтворана ў ЗША, альбо дачыныя структуры, якія створаны амерыканскімі грамадзянамі і арганізацыямі па-за межамі ЗША, не маюць права на фінансавыя транзакцыі і гандаль з названай структурай. Санкцыі распаўсюдзіліся як на галоўную арганізацыю, так і на ўсе прадстаўніцтвы "Белнафтахіма" ў ЗША, Германіі, Расіі, Кітаі, Украіне, Польшчы і краінах Балтыі, якія вядуць разлікі ў доларах ЗША праз карэспандэнцкія рахункі амерыканскіх банкаў і карыстаюцца партнёрствам альбо пасрэдніцтвам амерыканскіх фірм.

Канцэрн "Белнафтахім" у 2003—2007 гг. аб'ядноўвае 50—80 арганізацый і прадпрыемстваў з агульнай колькасцю занятых прыкладна 120—130 тысяч чалавек. Ягоная асноўная экспартная прадукцыя складаецца з нафтапрадуктаў (56%), калійных угнаенняў (16%), аўтамабільных шын (6,6%), хімічнай кудзелі і нітак, пластычных мас, фарбаў і лакаў. У выніку сваёй дзейнасці **канцэрн забяспечвае пятую частку прыбыткаў бюджэту Беларусі, чвэрць прамысловай вытворчасці і трэцюю частку экспарту і валютнай выручкі**. Тэмпы росту прадукцыйнасці працы і інвестыцый у асноўны капітал за 2003—2007 гг. былі не менш за 140%, экспарту, у адпаведны перыяд, не менш за 180%. Прадукцыя канцэрна прадаецца ў 80 краінах.

Дзякуючы спрыяльнай кан'юнктуры ў 2003—2007 гг. штогод у развіццё вытворчасці канцэрнам інвеставалася не менш за 600 млн долараў ЗША. Гэта дазволіла арганізаваць вытворчасць канкурэнтаздольнай прадукцыі: шматслойных поліпрапіленавых плёнак, бензінаў і дызельнага паліва з нізкім утрыманнем серы, араматычных вуглевадародаў, тэхнічнай, харчовай і кармавой солі, цвёрдых і вадкіх комплексных угнаенняў, метанолу, поліэтыленавых і поліпрапіленавых водаправодных і газавых труб, канструкцыйных пластмас, трывалага віскознага і поліаміднага корду.

Варта зазначыць, што канцэрн сустрэў практычнае ўвядзенне санкцый у дастаткова добрым эканамічным стане. За дзевяць месяцаў 2007 года (даныя былі апублікаваны на выязной нарадзе кіраўніцтва канцэрна 1 лістапада 2007 г. на Гомельскім хімічным заводзе) прырост прамысловай прадукцыі склаў 6,1% да ўзроўню адпаведнага перыяду мінулага года. Новая прадукцыя склала дзесятую частку, а сертыфікаваныя 8/10 агульнай вытворчасці. Вага наўпроставых паставак у экспарце дасягнула 62%. Разам з тым планавыя тэмпы росту экспарту не былі дасягнуты.

Тым часам інфармацыя пра юрыдычныя адрасы і іншыя рэквізіты заблакіраваных структур была афіцыйна распаўсюджана са спасылкай на ОФАК сярод усіх зацікаўленых. **Высветлілася, што ў дасланы спіс блакіраваных структур не ўвайшлі асноўныя прадпрыемствы — экспарцёры канцэрна, то бок асноўныя пакупнікі і прадаўцы расійскіх вуглевадародаў або аб'яднанне "Беларуськалій".** Санкцыі кранулісяўласна офісаў канцэрна "Белнафтахім" у Мінску, Кіеве, Маскве, Франкфурце, Пекіне і Рызе, а таксама кампаніі Belneftekhim USA.

Гэта пакідала магчымасць беларускім уладам без вялікіх пакут залагодзіць сітуацыю. Трэба зазначыць, што санкцыі дэ-факта анансаваліся ўрадам ЗША за некалькі тыдняў ці нават месяцаў да іх увядзення, і, прымаючы пад увагу спецыфіку эканамічных сувязяў паміж дзвюма краінамі, беларускім уладам не складала цяжкасці разлічыць напрамак удару і прыняць адпаведныя меры па мінімізацыі наступстваў. Фактычныя страты "Белнафтахіма" ў 2007 годзе будуць роўныя памеру сродкаў, якія заблакіраваныя на рахунках ягоных філіялаў, што не фатальна, бо разліковыя ланцужкі ідуць ад канкрэтных прадпрыемстваў і надзейна прадубліраваны. Да таго ж, калі да санкцый не далучаецца Еўрапейскі Саюз, што магло насамрэч прывесці да сур'ёзных наступстваў (такое далучэнне на ўзроўні Саюза, аднак, выглядае цалкам неверагодным, бо наўпрост ішло б уразрэз з уласнымі эканамічнымі інтарэсамі ЕС), гісторыя, здавалася б, не магла мець істотнага працягу. Такія разважанні, аднак, абмінулі адну акалічнасць: нават калі ўрад ЗША не мае магчымасцяў наўпрост заблакіраваць працу канцэрна, існуюць інструменты ўскоснага ўціску на кампаніі і фінансавыя інстытуты, якія вядуць з ім бізнес. Як высветлілася пазней, гэтыя інструменты яшчэ далёка не вычарпаны.

Банкі краін Балтыі, што цесна супрацоўнічаюць з вядучымі амерыканскімі структурамі на сваім рынку, пачалі блакіраванне сродкаў "Белнафтахіма" 14 лістапада 2007 г. Першымі ў гэтай справе сталі напрыканцы года лакальныя падраздзяленні шведскай фінансавай групы "Hansabank" у Рызе і "Hansabank" у Таліне, што распачалі блакіроўку транзакцый па рахунках "Belneftehim Baltic OU" і "Belneftehim Baltic SIA". Падобна, што нашы паўночныя суседзі згодны несці страты ад сітуацыі з "Белнафтахімам" і досыць вялікія, бо памер ягонага транзіту, прыкладам, праз Латвію складае 12 мільёнаў тон грузаў, што дае больш за 170 мільёнаў долараў аплаты тым, хто забяспечвае рух. Летась аб'ёмы перавалкі нафтапрадуктаў склалі: праз Латвію — 71,2 %; Эстонію — 18,6 %; Літву —10,2 %.

Новы і больш істотны паварот справе можа быць дадзены неўзабаве. Амбасадар ЗША ў Беларусі Карэн Сцюарт паведаміла 13 снежня 2007 года **пра магчымасць пашырэння санкцый супраць падкантрольных канцэрну прадпрыемстваў і прадпрыемстваў, што ў падначаленні людзей, якім забаронены ўезд у ЗША**. Выключэнне складуць хіба венесуэльскія фірмы, дзе беларускі канцэрн стаў малодшым партнёрам. Варта зазначыць, што гэтая заява адбылася праз дзень пасля падзей на вуліцах Мінска, у ходзе якіх адбыліся новыя сутыкненні АМАПа з апазіцыяй.

Калі ў спіс патрапяць буйныя прадпрыемствы Наваполацка, Салігорска, Магілёва, Бабруйска і іх гандлёвыя і пасрэдніцкія фірмы, гэта можа стаць сапраўды рэальнай і вялікай пагрозай рынку нафтапрадуктаў і ўгнаенняў, бо разлікі ягонымі ўдзельнікамі вядуцца ў доларах праз пасрэдніцтва амерыканскіх структур.

Тэарэтычна з боку канцэрна магчымы пераход у разліках на еўра альбо выкарыстанне пасрэдніцтва арабскіх банкаў у ажыццяўленні беларускіх экспартна-імпартных аперацый з нафтай і прадуктамі яе перапрацоўкі. Але тут, у любым выпадку, прадказальная малая імавернасць хуткай арганізацыі эфектыўных разлікаў. Насцярожанасць партнёраў і кліентаў канцэрна па ўсім свеце непазбежна ўзрастае. **Такім чынам, у 2008 годзе палітычная рызыка застаецца галоўнай перашкодай для пашырэння бізнесу і тым больш для прыцягнення інвестараў у сферу дзейнасці "Белнафтахіма"**, бо відавочна, што з набліжэннем выбараў у парламент у 2008 годзе могуць адбыцца падзеі, якія выклічуць новы раунд уціску на беларускія ўлады з боку Злучаных Штатаў. У выпадку, калі санкцыі пашырацца на транзіт і разлікі прадпрыемстваў, страты могуць быць непараўнальна большыя за тыя 17 тысяч долараў ЗША, пра якія зараз гавораць беларускія ўлады.

Народная Воля http://www.nv-online.info
14 САКАВІКА 2008 г.

НЕЗАВИСИМАЯ ЭКСПЕРТИЗА

Учиться ухаживать за «капризной дамой»

Включать административные механизмы относительно легко. Научиться пользоваться рыночными — значительно сложнее. Но именно они наиболее эффективны при ухаживании за "капризной дамой" по имени Инфляция.

Борис ЖЕЛИБА, *профессор, доктор экономических наук*

В советской экономике инфляции не было. По крайней мере, это слово советские люди связывали с заграницей, воспринимая как порождение капиталистической экономики. Это где-то там, но не у нас. Действительно, насколько помнится, в те же 60-е годы цены в Советском Союзе на многие товары, продукты питания, услуги не менялись годами. Предприятия продавали свою продукцию по прейскурантам, которые действовали по пять и более лет без особых изменений. Прейскуранты утверждались государственными органами ценообразования в лице Государственного комитета цен СССР, Госкомцен союзных республик и так далее.

Однако зарплата работников росла ежегодно. И население, субъекты хозяйствования все чаще стали сталкиваться начиная с 1970-х с другим понятием, как выяснилось — порождением социалистической экономики, — дефицитом товаров. Всеобщий характер дефицит приобрел к периоду распада Советского Союза и развала советской экономики. И тоже сыграл в этом развале не последнюю роль. Вместо слова "купить" употреблялось "достать". Доставали все и всё. Население — телевизоры, холодильники, импортную высококачественную обувь, одежду. Из продуктов питания — деликатесы, к которым относились сухая колбаса, рыбные консервы, копчености.

Предприятия пробивали фонды по сырью, материалам. Все лимитировалось. Появился институт снабженцев-толкачей. Люди, бывавшие за границей, все чаще задавались вопросом, почему у них там есть все, а у нас — ничего. Иностранцы, посещавшие Советский Союз, ничего не могли понять в нашей экономике. В гастрономах полки полупустые, в гостях принимают — стол ломится от яств. Видят на людях интересную одежду, меха, а приходят в магазины с деньгами — там ничего такого и близко нет. Зато об инфляции, в отличие от иностранцев, мы ничего не слышали.

С течением времени, когда мы стали более грамотными в области макроэкономики, пришло понимание того, что инфляция в советской экономике проявлялась в скрытой форме. Государство цены искусственно, административным путем "держало", а доходы населения так или иначе увеличивались. Все это и выливалось во всеобщий дефицит, который принимал все более уродливые формы: торговля из-под прилавка, с черного хода, фарцовка, "черный рынок". В конце 1980-х — талоны почти на все продукты питания, не всегда обеспеченные товарами. Приходило понимание: так жить нельзя.

После распада СССР первой объявила о введении свободных рыночных цен Российская Федерация. Это случилось 1 января 1992 года. За Россией вынуждены были в той или иной мере последовать все постсоветские республики. За год-два пустая Москва наполнилась товарами. За эти же год-два цены на многие товарные позиции подпрыгнули в десятки раз. Постсоветские люди в одночасье лишились всех своих сбережений. Тогда они и начали знакомиться с разновидностями многоликой гидры инфляции: гиперинфляция, галопирующая, импортируемая, спроса, предложения и т.д. и т.п. Она уже была здесь, дома, а не "за бугром". Причем в самых жестких формах. Если измерять инфляцию ростом цен, а это инфляция спроса, то она в начале 1990-х годов доходила до 30—40% в месяц. В магазинах не успевали менять ценники. А населению надо было успевать тратить зарплаты.

Бушевала инфляция и в 1998-м, 1999 году, когда российское правительство объявило "дефолт" — отказ своевременно отвечать по своим обязательствам в виде облигационных займов. Российский финансовый кризис задел и Беларусь, и наша годовая инфляция вновь стала измеряться сотнями процентов. Утихомирить ее удалось в конечном счете к 2006 году, когда годовой рост цен на потребительском рынке уложился в 7%.

Считается, что если темп инфляции не превышает 10% в год, то ее можно квалифицировать как умеренную. Долгое время по темпам инфляции Беларусь держала печальное первенство среди экономик СНГ. Наконец в 2006 году мы его уступили, опустившись по этому показателю даже ниже России. Это достижение, безусловно, можно отнести к заслугам Нацбанка и правительства .

Поскольку инфляция — явление глобальное, ей подвержены экономики всех стран. Вопрос только, в какой мере. Специалисты от макроэкономики выработали достаточно большое количество антиинфляционных инструментов. Их можно свести в две группы: преимущественно административные и преимущественно рыночные. Если государство фиксирует цены, устанавливает предельную рентабельность продукции, предельные торговые надбавки, мы имеем дело с первой группой инструментов. Если же его усилия направляются на создание в экономике конкурентной среды, когда производителей той или иной продукции, своих и чужих, государственных и особенно частных, на рынке множество и они конкурируют между собой за покупателя, тогда автоматически включаются рыночные механизмы торможения и даже снижения цен.

Включать административные механизмы относительно легко. Научиться пользоваться рыночными — значительно сложнее. Возьмем на себя смелость заявить, что наше правительство предпочитает административное управление ценовыми процессами. Помимо устанавливаемых цен на социально значимые товары и регулирования цен на товары производителей-монополистов, предприятиям, концернам определяются предельные индексы роста цен на их продукцию. На новую продукцию предприятия обязаны обосновать цены с представлением в госорганы ценообразования соответствующих калькуляций себестоимости. Применяются и другие, в т.ч. вышеперечисленные административные инструменты. Особенно тщательно органы ценообразования регулируют, отслеживают цены на продукцию для населения. Свидетельством того является, как правило, более низкий индекс роста цен на потребительском рынке, нежели на рынке предприятий. Тем не менее возникают и неконтролируемые процессы. К примеру, недавний стремительный рост цен на жилье, когда стоимость квадратного метра достигла 1500 и более долларов.

Инфляция — дама сезонная. Ее годичные тренды иногда похожи, как братья-близнецы. Пик роста цен обычно приходится на зимние месяцы. К лету она снижается. А в августе цены замирают. Мертвый сезон. К августу созревает урожай овощей и фруктов. Цены на плодоовощную продукцию снижаются, что благотворно влияет на индекс инфляции в целом. К Новому году инфляция вновь поднимает голову. Трудящимся выдают новогодние премии, тринадцатые и четырнадцатые зарплаты. В общем, рождественские и новогодние праздники. Министерство статистики и анализа отслеживает инфляцию ежемесячно, и ежемесячно темпы роста цен на потребительском рынке, который нам, населению, более всего интересен, публикуются в широкой печати. Правда, корзинка товаров, по которой Минстат замеряет рост цен, мягко говоря, бедноватая. Цены на недвижимость туда точно не попадают, как и не попадают многие наименования иных товаров. Других данных все равно никто официально по инфляции не дает. Поэтому Минстат частенько многие поругивают за стремление занизить реальный рост цен, когда сравнивают его данные с ценниками в магазинах и на рынках.

Инфляцию, как и все у нас, планируют. Планируют в последние годы на снижение. И начиная с 2000-х годов она действительно снижалась. Так и на истекший 2007 год индекс потребительских цен прогнозировался в интервале 6—8%. Это означало ежемесячный рост цен на 0,5—0,6%. По итогам еще 9 первых месяцев рост цен составлял 5,4% и укладывался в запланированные рамки. Но уже в ноябре-январе ежемесячная инфляция вылезла за 2%. А по итогам четвертого квартала рост потребительских цен составил 6,3%. Зная, что инфляция подвержена сезонному фактору, все же такой агрессивный ее скачок никто не предполагал. В итоге за 2007 год мы получили печальные 12,1%. Анализ показал, что из общего роста в 12,1% наибольший прирост дали цены на молочные продукты (1,6%), тарифы жилищно-коммунального хозяйства (1,3%). Прирост цен на промышленную продукцию составил 17,1%. Первыми и наиболее ощутимо скакнули цены на подсолнечное масло, а затем "поплыло" все продовольствие. Как оказалось, и по всему миру. Когда там цены больше, отечественное продовольствие начинает уплывать за границу. Кроме того, начиная с июля Беларусь гасила задолженность за российский газ и с июля начала по полной за него рассчитываться — 100 долларов за 1000 кубометров. В то время как в 2006 году мы платили 46,68 доллара. Рост в 2,14 раза — не шутка. Влияние на инфляцию внешних факторов очевидно. С прогнозами по инфляции не справились Казахстан (порядка 18%), Украина (14%), Россия (11%) и другие страны Содружества. Однако Литва за 2007 год показала 5%. Для развитых стран характерна годовая инфляция в 2—3%.

С инфляцией тесно связана процентная политика на финансовом рынке страны, которую у нас в первую очередь определяет Нацбанк. Имеются в виду кредитные, депозитные ставки, ставка рефинансирования Нацбанка. Если по ставке рефинансирования Центробанк кредитует коммерческие банки, то последние, получив централизованные кредиты, ссужают их клиентам, прибавляя кредитную маржу. От нее зависят доходы коммерческих банков. В банковской системе Беларуси кредитная маржа административно ограничена тремя процентами. Ставка рефинансирования, отражая нижний порог кредитования, должна быть выше уровня инфляции. В противном случае инфляция будет съедать доходы от кредитования, что ведет к исчерпыванию банковских ресурсов. Ставка рефинансирования Нацбанка еще с конца прошлого года, невзирая на растущую динамику инфляции, удерживается на уровне 10% годовых. Следовательно, реальная ставка рефинансирования, которая определяется как номинальная за вычетом уровня инфляции, к концу 2007 года приобрела отрицательные значения (10% — 12,1% = -2,1%). Нацбанк на сегодня проводит отрицательную процентную политику.

Дорогие кредиты не выгодны реальному сектору экономики. Но политика "дорогих денег" как раз и подавляет инфляцию. В итоге ставка рефинансирования остается неизменной. Отрицательная процентная политика продолжает наносить экономический ущерб коммерческим банкам. Какой смысл им кредитовать предприятия под 13% при инфляции 12,1%? Поэтому банки настаивают на повышении ставки рефинансирования или на отмене 3%-ной кредитной маржи. Все большее число банковских вкладчиков задается таким же вопросом: какой смысл в рублевых депозитах, если они дают 12—14% годовых? Как показывает банковская статистика, рублевые депозиты населения продолжают расти. Скажем, пока по инерции. Все больше вкладчиков понимают, что с учетом роста валютного курса евро выгоднее евровклады. А с учетом нашей рублевой инфляции достаточно просто держать евро или российские рубли в чулке. Чем грозит отток рублевых вкладов банковской системе — говорить излишне.

Необходимо отметить, что еще в прошлом году темпы роста валютных вкладов были интенсивнее рублевых. А реальная доходность рублевых банковских вкладов была значительно ниже роста цен на некоторые драгоценные металлы. Так, за 2007 год цена на золотые слитки выросла на 26,7%. Доходность банковских депозитов в евро и российских рублях с учетом роста их обменных курсов, т.е. в пересчете на белорусские рубли, составила соответственно 17—19 и 16—18%. Мы же видим, что и по прошествии двух месяцев 2008 года Нацбанк не трогает ставку рефинансирования. Надо полагать, надеется, что под влиянием сезонных факторов она уляжется сама собой. Перед руководством Нацбанка постоянно висит и реальная угроза невыполнения прогнозных параметров и на текущий год. Напомним, что они остались в основном те же, что и были запланированы на прошлый год: инфляция — 6—8%, ставка рефинансирования — 7—9%, стоимость кредитных ресурсов — до 10—12%.

С получением российского кредита в 1,5 млрд долларов поддерживать долларовую стабильность белорусского рубля Нацбанку станет полегче. Удерживать в заданных пределах его курс к евро и российскому рублю будет сложнее. Девальвация национальной валюты дополнительно провоцирует инфляцию.

Более того, инфляция дама капризная. Она "отвязывается" от процессов девальвации и даже, как показывают обменные курсы российского рубля, ее нисколько не пугает и революция национальной валюты. Несмотря на укрепление российского рубля к доллару, Россия никак не может уложить свою инфляцию в рамки 10%. Учитывая уроки прошлого года, и белорусским денежным властям следовало бы поставить менее амбициозную и более реальную задачу — не выйти с инфляцией за 10% годовых. Для чего в большей мере надо обращаться к рыночным инструментам влияния на процессы ценообразования.

Казалі адно, выходзіць — другое

Казалі, што камунальныя плацяжы павялічаны на пяць долараў.

Але вось атрымліваю квіток аб іх аплаце за студзень. Месяц таму было 104.090 рублёў, стала 121.740. На 16,6 тысячы больш, або амаль на 8 долараў. А яшчэ месяц таму плата складала 98 тысяч. За тры месяцы плата камунальнікам вырасла на 23 тысячы рублёў, больш як на 10 долараў.

Яўген ТАЎГЕНЬ.

Збіраюцца ад'язджаць

На пачатак сакавіка на рынках і ў гандлёвых цэнтрах Брэста закрыта каля 25% гандлёвых месцаў індывідуальных прадпрымальнікаў.

Пра гэта паведаміў БелаПАН старшыня Брэсцкага аддзялення грамадскага аб'яднання "Перспектыва" Віктар Чайкоўскі.

Паводле яго слоў, гэта звесткі без уліку тых, хто "не працуе ў сувязі з перарэгістрацыяй", "адпачынкам" або "паехаў за таварам".

"У прыватныя унітарныя прадпрыемствы перайшлі тыя ІП, якія займаюцца прадуктамі харчавання або прадастаўленнем паслуг насельніцтву. Наколькі мне вядома, шэраг прадпрымальнікаў абласнога цэнтра вымушаны згарнуць свой бізнес, маюць намер адкрыць яго ў прылеглых рэгіёнах Украіны, дзе больш спрыяльныя эканамічныя і заканадаўчыя ўмовы для вядзення малога бізнесу, — сказаў В.Чайкоўскі. *— Сумна, што з Беларусі збіраюцца ад'язджаць працаздольныя людзі. Не менш сумна і тое, што сітуацыю з прадпрымальнікамі бачыць падрастаючае пакаленне. Пасля ўсяго гэтага ці захоча яно ў будучым жыць у такой краіне?"*

На думку В.Чайкоўскага, павелічэнне стаўкі адзінага падатку для індывідуальных прадпрымальнікаў, якое прадугледжваецца, прывядзе да таго, што тыя, хто не мае магчымасці заплаціць яго, вымушаны будуць працаваць па шэрых схемах.

Ларыса ШЫГАНАВА.

Пудзілы для інвестара

Беларускае заканадаўства назваць спрыяльным для прыцягнення інвестыцый нельга

Адмена "залатой акцыі" — крок прагрэсіўны, але недастатковы, каб гаварыць аб істотным паляпшэнні інвестыцыйнага клімату ў краіне. Аб гэтым заявіў БелаПАН незалежны эксперт эканаміст **Сяргей Балыкін**.

"Зразумела, знешне "залатая акцыя", якая прадугледжвала магчымасць для дзяржавы фактычна камандаваць суб'ектам гаспадарання, выглядала пудзілам для інвестара. Але любы сур'ёзны інвестар, калі прымае рашэнне аб інвестыцыях, вывучае інвестыцыйны клімат у комплексе. На жаль, беларускае заканадаўства спрыяльным для прыцягнення інвестыцый назваць нельга", — канстатаваў С.Балыкін.

У краіне захоўваецца адміністрацыйнае рэгуляванне цэнаўтварэння, нармаванне затрат, якія прадпрыемства можа ўключыць у сабекошт, штучнае абмежаванне памеру зарплаты і г.д. *"Праблемай з'яўляецца беларуская падатковая сістэма, прычым не столькі з-за памераў ставак, колькі з-за супярэчнасці і заблытанасці,* — зазначыў эксперт. — *Напрыклад, многія падаткі і плацяжы маюць фактычна аднолькавую базу, і тэарэтычна іх можна было б аб'яднаць у адзін падатак або плацеж. Парадак налічэння падаткаў заблытаны, і вельмі часта памылка ў адным падатку цягне за сабой іншыя, што прыводзіць да пакаранняў".*

С.Балыкін звярнуў увагу на тое, што ў краіне недастаткова абаронена права прыватнай уласнасці: *"Фіскальныя органы маюць права без рашэння суда спісваць грашовыя сродкі з рахункаў суб'ектаў гаспадарання. Існуе таксама практыка накладання адміністрацыйных спагнанняў без рашэння суда".*

"Без вырашэння гэтых і іншых праблем гаварыць аб сур'ёзным паляпшэнні дзелавога клімату не даводзіцца", — канстатаваў эксперт.

Пры гэтым ён зазначыў, што за апошнія некалькі месяцаў было прынята шмат актаў, скіраваных на лібералізацыю эканамічных адносін. Напрыклад, дэкрэты аб спрашчэнні рэгістрацыі суб'ектаў гаспадарання і аб ільготах бізнесменам у малых гарадах і сельскай мясцовасці, аб гарантыях для дзейнасці інвестараў СЭЗ. Хоць гэтыя акты і вырашаюць важныя пытанні, згаданых мер недастаткова, лічыць С.Балыкін.

"На жаль, беларуская ўлада, падобна, не можа адважыцца на хуткую і ўсеагульную лібералізацыю эканамічных адносін. Справа абмяжоўваецца паўмерамі. Але гэта якраз той выпадак, калі рабіць напалову горш, чым не рабіць наогул, паколькі тактыка паступовай ліквідацыі бар'ераў вядзе да з'яўлення прамежкавых перашкод", — упэўнены незалежны эксперт.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

Маленькая ўсмешка Еўропе

Дырэктар аналітычнага цэнтра "Стратэгія" **Леанід Заіка** лічыць, што адмена "залатой акцыі" не паўплывае на прыток замежных інвестыцый. Такое меркаванне ён выказаў у інтэрв'ю БелаПАН.

"Сур'ёзныя інвестары цяпер абмяркоўваюць здзелкі ў Маскве, Кіеве, Вільнюсе, Варшаве і вельмі спакойна ідуць на стварэнне сур'ёзных сумесных прадпрыемстваў, і толькі тут, у Мінску, у нашай патрыярхальнай і правінцыйнай краіне, можна думаць, што адмена "залатой акцыі" на штосьці паўплывае", — кажа ён.

Л.Заіка зазначыў, што *"цяпер на фоне вялікай гульні з Еўропай, калі трэба ахвяраваць маленькімі фігурамі, напрыклад, пешкай, адмена "залатой акцыі" — гэта маленькі знак, маленькая ўсмешка Еўропе".*

На думку дырэктара цэнтра, "залатая акцыя" была *"сімвалам упартасці беларускага ўрада да дрэнных хлопцаў, якія займаюцца інвестыцыямі і могуць рабіць у нас усё, што заўгодна".* Ён лічыць, што *"ёсць і была пэўная міфалагізацыя "залатой акцыі", і яна ўводзілася ў выключных, форс-мажорных выпадках, калі прадпрыемства з доляй дзяржавы знаходзілася на мяжы банкруцтва".* На думку эксперта, *"для нармальнага інвестара асаблівых цяжкасцяў гэтае выключнае права дзяржавы не выклікала".*

ПРОБЛЕМА

Климат ставит условия экономике Беларуси

Ученые мира бьют тревогу относительно изменения климата. Загрязнение атмосферы формирует глобальное потепление. По последним данным, общемировая температура уже поднялась на 0,74 градуса и продолжает увеличиваться.

Потепление климата — проблема, затрагивающая интересы любого государства. В экономике каждой страны есть отрасли, которые зависят от погодных условий. Например, в Беларуси 41% ВВП производится, если так можно сказать, погодозависимыми отраслями.

"В Беларуси за последнее десятилетие климат потеплел на 1 градус, — говорит руководитель Департамента по гидрометеорологии Министерства природы и охраны окружающей среды Мария Герменчук. — *И, к слову, в Беларуси, Молдове и Польше потепление идет быстрее, чем в среднем по миру. Проявляется это тем, что в стране ежегодно стало фиксироваться от 6 до 30 случаев экстремальных погодных явлений — наводнений, сильных ветров и обильных осадков, почвенные засухи, а также краткосрочное поступление холодного арктического воздуха".*

По словам Марии Герменчук, в связи с этим в Минприроды разрабатываются инструменты ограничения выбросов промышленностью парниковых газов в атмосферу. В Беларуси создается Национальная климатическая программа, куда включены предложения, которые представили те самые погодозависимые отрасли экономики: Минлесхоз, Минсельхозпрод, Минэнерго, Минстройархитектуры.

"Все это требует денег, но их придется изыскивать в бюджете для устойчивого развития нации, — подчеркивает Мария Герменчук. — *К примеру, несмотря на принятые меры создания защитных сооружений, мы каждый год готовимся к паводку, как к стихийному бедствию".*

Однако, по некоторым данным, есть и польза от потепления климата. В Беларуси начала формироваться новая агроклиматическая зона с благоприятным ведением сельского хозяйства для некоторых новых культур — она сравнима с условиями северной и центральной части Украины. Ученые говорят, что из-за того, что увеличивается количество фотоактивной радиации (это не часть чернобыльской, а радиация как солнечное излучение), будет возрастать урожай. Если, конечно, соблюдать условия правильной агротехнической обработки посевов.

"Правда, к выращиванию южных культур надо подходить очень осторожно, — говорит Мария Герменчук. — *Радикальные изменения в земледелии ни к чему хорошему не приводили, так что позитивное изменение климата надо рассчитать, учитывая риски и потери".*

К слову, наиболее развитые страны не смогли достичь даже скромных сокращений промышленных выбросов порядка 4% от уровня 1990 года, согласованных в Киотском протоколе. Ученые прогнозируют, что стоимость предотвращения опасных изменений климата может составить менее двух третей текущих военных расходов.

Галина ЕФИМОВА.

ЦИТАТА В ТЕМУ

Во время презентации в Минске доклада ПРООН о человеческом развитии 2007/2008 под названием "Борьба с изменениями климата" и.о. представителя ПРООН в Беларуси Леван Буадзе заявил: "Большинство ученых сошлись во мнении по поводу того, что потепление климата вызвано в основном деятельностью человека, т.е. выбросами диоксида углерода (CO2) в атмосферу, в результате чего образуется "парниковый эффект". Если эта тенденция сохранится, то к 2032 году среднегодовая температура увеличится на 1,3 градуса и будет расти дальше. Это может привести к катастрофе и необратимым последствиям — под угрозой могут оказаться жизнь и благополучие миллионов людей.

Не хочаш раскашэліцца — прымусім!

Да мінчан, якія адмаўляюцца ўстанаўліваць прыборы ўліку вады, будуць прымяняцца санкцыі.

Аб гэтым заявіў на прэс-канферэнцыі начальнік аддзела энергетыкі Мінгарвыканкама Анатоль Лаўнячук. *"Магчыма, трэба будзе прымаць нейкія меры, каб прымусіць грамадзян устанаўліваць прыборы ўліку гарачай і халоднай вады. Гэта будуць адміністрацыйныя або іншыя меры",* — сказаў ён. Якія канкрэтна, А.Лаўнячук удакладніць адмовіўся. Паводле яго слоў, перад ЖРЭА Мінска пастаўлена задача да чэрвеня ўстанавіць прыборы ўліку гарачай і халоднай вады "ў тых, хто жадае, хто не адмаўляецца".

На сёння, паводле даных чыноўніка, у Мінску аснашчана прыборамі ўліку гарачай і халоднай вады 460 тыс. кватэр (77,2%), засталося аснасціць 155 тысяч. *"У вырашэнні гэтага пытання ёсць свае праблемы. На сёння каля 40 тыс. ўласнікаў кватэр адмаўляюцца ад устаноўкі прыбораў",* — сказаў А.Лаўнячук. *"Больш за ўсё нас хвалююць грамадзяне, якія хранічна не плацяць за кватэру",* — падкрэсліў спецыяліст.

Наталля КАРОТКАЯ.

Ліпавы рост

У Беларусі ў студзені 2008 года рознічны тавараабарот, уключаючы грамадскае харчаванне, праз усе каналы рэалізацыі склаў 3 трлн 450,4 млрд рублёў і ў супастаўных цэнах павялічыўся на 16,2% у параўнанні з узроўнем студзеня 2007 года.

Рознічны тавараабарот гандлю склаў 3 трлн 277,1 млрд рублёў (на 16,7% больш), арганізацый грамадскага харчавання -- 173,3 млрд. рублёў (на 7,2%).

Такую інфармацыю пратыражавалі многія СМІ. З яе вынікае, што беларусы ў сёлетнім студзені купілі намнога больш тавараў, чым летась у такі ж час. Выходзіць, паляпшаецца жыццё. Але звернем увагу на адну акалічнасць. Рост даецца не ў кілаграмах, а ў рублях.

А цэны за год істотна выраслі. Як сведчаць даныя Міністэрства статыстыкі, індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў студзені 2008 года ў параўнанні са студзенем 2007 года склаў 112,9 працэнта. Словам, амаль за тыя ж самыя прадукты, тавары і паслугі мы сталі плаціць на 13 працэнтаў болей. Вось такі атрымліваецца ліпавы рост.

Яўген ТАЎГЕНЬ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
14 САКАВІКА 2008 г.

ПО СУЩЕСТВУ

Где вы, защитники пенсионеров?

Если не ошибаюсь, в Беларуси насчитывается где-то почти два с половиной миллиона пенсионеров. После лишения льгот многие из них оказались в крайне тяжелом положении. Действительно, можно ли выжить при пенсии 300—400 тысяч рублей? Да больным людям на одни лекарства нужно тысяч сто. А тут еще растет плата за жилье, коммунальные услуги...

Кто поможет, кто защитит пенсионеров? Вопрос, считаю, очень важный. Особенно для нашей страны, где профсоюзы фактически превратились в придаток государственных структур и по сути не являются защитниками интересов людей.

Есть республиканская ветеранская организация во главе, кажется, с генералом Новиковым. Но вы слышали, чтобы тот же генерал Новиков возмутился отменой льгот для пенсионеров? Я лично не слышал. Для него, конечно, эти льготы большого значения не имеют. Небось, занимая место в парламенте да имея большие звезды на погонах, пенсия миллионов двух достигает. Скорее всего и зарплату еще получает. Что ему те льготы! А вот массе пенсионеров они ой как нужны! И тут бы ветеранской организации под руководством того же Новикова возвысить голос, стать во главе сотен тысяч обнищавших пенсионеров и потребовать от правительства, от Лукашенко срочно увеличить пенсии, вернуть лишенные льготы.

В руководстве этой ветеранской организации немало других начальников. Почему вы, друзья, молчите? Понятно, легче заглядывать в рот тому же Лукашенко, чем принципиально поставить перед ним вопрос: или улучшай жизнь миллионов простых людей, или передай власть другому, который лучше будет решать эту крайне важную проблему. Терпеть-то больше нельзя. Посмотрите, сколько могил прибавляется на кладбищах каждый день! А почему у нас средняя продолжительность жизни на 15—20 лет ниже, чем у людей развитых стран? Да потому, что жизнь нищенская.

Так что где вы, защитники пенсионеров? Миллионы людей ждут вашей защиты.

Иван КИСЛЯКОВ, 59 лет.

Крутиться нужно!

С интересом читаю в "Народной воле" материалы под рубрикой "Дискуссия". Хотя мне не очень нравится, когда некоторые авторы в своих рассуждениях опускаются до уровня "кухонных" разборок.

Если разговор вести о пенсиях, то все гораздо проще. Раз размер пенсии в первую очередь зависит от величины зарплаты, то надо спросить у правительства: почему у чиновников, депутатов зарплаты не в два-три раза, а в десятки раз выше, чем у рядовых смертных? Такой разбежки не должно быть.

Во-вторых, надо бы самому своевременно позаботиться о своих трудовых доходах, которые пойдут потом в расчет пенсии. Года три назад был у нас работник один. Каждый месяц по несколько дней брал отпуск за свой счет, а потом ругался с мастером: "Почему у меня зарплата низкая?" Опаздывал, нарушал и поэтому лишался доплат. О какой пенсии, вернее о ее нормальном размере такому человеку можно мечтать?

Крутиться надо, если здоровье позволяет, не лодырничать, подрабатывать, а не сидеть на одном месте за 300 тысяч в месяц. Другое дело, если вообще работы найти невозможно. Но это редкость.

Итак, мизерная пенсия начисляется с мизерной зарплаты. Это раз. Второе — трудовой стаж. У моей жены, например, пенсия 285 тысяч рублей. Зарплата была сравнительно неплохая, но стажа всего лишь 20 лет "наскребла". То домохозяйкой была, то работы не было, то отдохнуть хотелось... Как говорится, оглянуться не успела, как пришли преклонные годы и здоровье стало никудышным. Вот тебе и вся дискуссия.

Анатолий Евгеньевич ДОРОШЕНКО, минчанин.

Напрасно они думают, что им удастся заставить нашу любимую газету замолчать

Я постоянный подписчик газеты "Народная воля" и всегда с нетерпением жду каждый номер, несущий правдивую и объективную информацию. Восхищаюсь мужеством коллектива редакции, издающего газету в столь сложных условиях.

Я решил поддержать инициативу читателя В.Р.Дзякова и посылаю 30.000 рублей в помощь газете. Надеюсь, что и другие читатели поддержат газету. Напрасно думают Пролесковский и Жулковская, что им удастся заставить нашу любимую газету замолчать.

С уважением —

Леонид Феликсович БЕРЕЗОВСКИЙ, житель Минска.

Аддаць зямлю сялянам, свабоду прадпрымальнікам — і Беларусь расквітнее!

Кожны раз, слухаючы валтузню паміж Беларуссю і Расіяй наконт коштаў на газ, складваецца ўражанне, што вось-вось для Беларусі наступіць апакаліпсіс і ўсе мы загінем, калі Расія не змілуецца і не знізіць кошты на газ.

Але ж нашы суседзі (Літва, Латвія, Польшча...) плацяць за газ у разы болей за нас і жывуць лепш за нас!

Беларусь не бяднейшая за гэтыя краіны, у нас ёсць сусветныя запасы харчовай і калійнай солі, многа лясоў, клімат спрыяльны для земляробства, геапалітычнае становішча такое, што толькі стой і збірай грошы за транзіт з усіх відаў транспарту. Мы маем не зусім адсталую прамысловасць і працавіты народ. Здаецца, можна жыць і золата важыць, а жывём мы як жабракі ў параўнанні з багатымі народамі і толькі чакаем новых крэдытаў, каб аддаць старыя даўгі...

А справа ў тым, што шалёныя грошы ідуць як у пясок у стратную, нежыццяздольную, паміраючую калгасную сістэму, а дзяржава не хоча даць сялянам зямлю, хоць фермер здольны аплаціць сваёй прадукцыяй за крэдыты без праблем, бо фермер зацікаўлены ў выніках сваёй працы і не будзе красці камбікорм ад сваіх свіней і прапіваць усё, што "дрэнна ляжыць".

Але ж фермера ў час выбараў не пасадзіш у аўтобус і не прымусіш яго галасаваць, як прыкажуць, бо ён стане свабодным чалавекам.

Тое самае можна сказаць і адносна індывідуальных прадпрымальнікаў, якія, у адрозненне ад людзей на дзяржаўным кантракце, не пойдуць на датэрміновае галасаванне, бо яны вольныя людзі, а дзяржава папросту баіцца свабодных людзей.

Рабства і прыгонніцтва даўно аджылі, і хочаш не хочаш, а перамены ў Беларусі адбудуцца, калі нас не праглыне Расія.

Мікалай КУКСО, жыхар г.п.Івянец.

ПОГЛЯД

Праляскоўскі сам сябе выкрыў

Паважаныя супрацоўнікі газеты "Народная воля"!

Прыміце словы ўдзячнасці за вашу працу, за вашы змястоўныя артыкулы аб нашай рэчаіснасці, гісторыі, культуры, спорце, аб слынных сынах нашай Беларусі. Чытаю "Народную волю" ад першага радка да апошняга. З інтарэсам чытаюць яе і мае знаёмыя, сябры.

Прачытаўшы ў "Народнай волі" артыкул аб карупцыі з боку Холада, які быў намеснікам у спадара Праляскоўскага, я была ўпэўнена, што апошні, нягледзячы на сяброўскія, дзелавыя адносіны з арыштаваным, не мае ніякага дачынення да гэтай справы. Але даведаўшыся аб яго звароце ў суд, пры гэтым недзе праз месяц, у мяне (і не толькі ў мяне) з'явілася другая думка: нешта ўсё-такі не так.

Сваёй скаргай у суд спадар Праляскоўскі сам сябе абвінаваціў. Суддзя Жулкоўская, лічу, вынесла вельмі несправядлівае рашэнне, прысудзіўшы газеце і аўтару артыкула такія шалёныя штрафы. Гэта можна патлумачыць толькі вельмі вялікім жаданнем пакараць газету і чалавека, які вельмі прафесійна напісаў артыкул. Не буду казаць, што кіравала суддзёй, але, мне здаецца, толькі не закон. Мы, чытачы газеты "Народная воля", ніякай абразы Праляскоўскага ў артыкуле М.Коктыш не ўбачылі.

Нягледзячы на мізэрную пенсію, я не магу застацца ў баку і не дапамагчы нашай любімай газеце і пералічваю на рахунак газеты "Народная воля" 35 тысяч рублёў і заклікаю ўсіх чытачоў і прыхільнікаў газеты па магчымасці падтрымаць газету. З нашай дапамогай газета будзе жыць!

З павагай —

Н.А.ЗЯНЬКЕВІЧ, мінчанка.

КАЛІ Б Я БЫЎ ПРЭЗІДЭНТАМ...

...Паставіў бы з галавы на ногі

Што і казаць, многае ў Беларусі пастаўлена з ног на галаву. А на галаве, на вушах хадзіць нельга, для гэтага ёсць ногі, а галава — для таго, каб думаць.

У нас жа на высокія пасады часта прызначаюцца такія людзі, пра якіх кажуць: без мазгоў, але яны, як выказаўся самы галоўны начальнік, добра рохкаюць ля кармушкі.

Каб навесці такі парадак, які існуе ў цывілізаваных краінах, сыходзячы з вопыту суседзяў, зрабіў бы неадкладна наступнае. Па прыкладзе, скажам, Літвы забараніў бы былым партыйным наменклатуршчыкам займаць пасады ў новых органах улады, выключэнне зрабіў бы толькі для людзей такога ўзроўню, як Бразаўскас, Прунскене і іншыя. Толькі такім чынам можна пазбавіцца ад вертыкальнай пустэчы.

Пазбавіўшыся ад гэтага наменклатурна-вертыкальнага бяздаддзя — недзеяздольнага, паслухмянага, безыніцыятыўнага, правёў бы выбары ў Вярхоўную Раду Рэспублікі Беларусь. Для гэтага перш за ўсё аднавіў бы Канстытуцыю 1994 года, распусціў бы падхалімскія фарміраванні накшталт "Белай Русі", БРСМ і г.д. На гэты пераходны час і для правядзення выбараў па еўрапейскіх стандартах прызначыў бы на пасаду прэм'ер-міністра Аляксандра Казуліна, а старшынёй ЦВК — А.Лябедзьку.

Пасля выбараў Вярхоўнай Рады правёў бы рэферэндум аб скасаванні пасады прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Хопіць з нас і парламенцкай рэспублікі.

Безумоўна, адмяніў бы ўсе ўказы, у якіх дапушчана парушэнне Канстытуцыі.

Не сумняваюся, што менавіта такія кардынальныя меры могуць выратаваць Беларусь, беларускі народ ад галечы і знішчэння, знішчэння яго незалежнасці, мовы, культуры, гісторыі, прывядуць да ўздыму эканомікі.

Безумоўна, усё, пра што я вяду гаворку, сёння з галіны фантастыкі. Але фантазіі рэальнай, у аснове якой — жаданне мільёнаў беларусаў жыць палюдску, дастойна. Можна не сумнявацца, што рана ці позна цяперашняе нежыццёвае ўладна-вертыкальнае нагрувашванне разваліцца, як дзіцячы пясочны домік. І ад яго праз гады нават успаміну не застанецца.

Хіба марыў хто нават за пару гадоў да развалу СССР, што ён так хутка знікне? Але ж знік — такі закон гісторыі: усе дыктатарскія рэжымы абавязкова знікаюць. Так што мае фантазіі небеспадстаўныя.

Мікалай ДЗЕЛЯНКОЎСКІ, літаратар.

Фелікс ШКІРМАНКОЎ

Сімфонія жыцця

(байка)

Спяваў маэстра-Салавей,
слухаць яго любілі.
І у найлепшыя часы яго
за ўсё хвалілі.
Былі і іншыя, канешне,
выканаўцы,
Таленавітыя былі
і самазванцы.
Між гэтых іншых спевакоў
круціўся Верабей вясковы,
Ён пры любым надвор'і пець
заўсёды быў гатовы.
Як мог чырыкаў кожны дзень
ад ранку да змяркання,
І ўсё чакаў ад слухачоў
у рэшце рэшт прызнання.

Ды дзе там, склалася
ўсё так,
Што быў забыты Салавей-
мастак.
Пра Вераб'я ніхто
не заікаўся!
І вось аднойчы Чалавек
ад цішыні прачнуўся.
Ён зразумець ніяк не мог
чаму навокал ціха?
А голас унутраны шаптаў,
што здарылася ліха,
Бо зніклі раптам Вераб'і,
якіх не заўважалі,
Калі цудоўна кожны дзень
нам Салаўі спявалі.

На сумнай ноце кропку
стаўлю я, на жаль,
Як патрабуе байкі жанр,
цяпер мараль:
Бясспрэчна, лідэр у спевах --
Салавей,
Але калі не будзе побач
з лідэрам звычайны
Верабей,
І гэта нам патрэбна
цвёрда знаць --
Жыцця сімфонія не зможа
загучаць.

Слаўгарад.

Адкуль пачынаецца дзікунства

Сціскаецца сэрца ад публікацыі Сяргея Гутарэвіча "...І стаў Сяргейка сіратой пры жывой маці", змешчанай у "Народнай волі" пад рубрыкай "Дзікунства". Балюча чытаць, як маленькіх дзетак, пераважна немаўлят, кідаюць іх бацькі. Паказальна, што гэта з'ява набывае амаль масавы характар.

Вядома, такое -- вялікі грэх з боку тых, хто дае жыццё. Хоць мне, гледзячы на тое, што адбываецца навокал у нашым жыцці, думаецца: такія здарэнні -- ні больш ні менш, як адгалінаванне, адвод-вынік генеральнага прынцыпу правячага сёння ў Беларусі жорсткага прамаскоўскага палітычнага рэжыму.

Ці не нагадваюць часта "нашы" ўлады ў адносінах да насельніцтва краіны і яго праблем тых гора-бацькоў, што пазбаўляюцца сваіх дзяцей?! І робіцца гэта з іх боку свядома дзеля ўласнага марнатраўнага існавання. Не абцяжараныя маральнасцю і кампетэнтнасцю ў справах наладжвання здаровага грамадскага і гаспадарчага жыцця сваіх суграмадзян, начальнікі рэжыму і іх памагатыя, увасобленыя ў карныя органы (КДБ, МУС, пракуратура, суды і іншыя) здзекліва і з пагардай ставяцца да тых, хто існуе за рысай беднасці (а такіх, я лічу, каля мільёна чалавек), да нацыянальнай гісторыі, мовы, культуры... "Дзякуючы" такой непрыхаванай палітыцы, у нашай краіне да грамадзян-сірот можна аднесці большую частку насельніцтва.

Паказальна яшчэ і вось што: каб увесь гэты пакрыўджаны і прыніжаны чалавечы матэрыял не думаў пра свае правы, яго імкнуцца спойваць.

Дык ці не час светлым сілам нашага жыцця пачынаць аб'ядноўвацца, каб супрацьстаяць усім праявам і формам дзікунства?!

Яўген ГУЧОК, ветэран працы.

Мінск.

ТАКОЕ ЖЫЦЦЁ

У завулку-тупіку

Завулак Фогеля ў Дзятлаве вельмі маленькі: шэсць хат на адзін бокды пяць на другі. Да нядаўняга часу тут быў тупік — заехаць можна, а каб выехаць, трэба было паварочваць назад.

Амаль усе насельнікі завулка людзі сталага веку. Усё жыццё сумленна адпрацаваўшы, зарабілі хто крыху больш за 300 тысяч рублёў пенсіі, а хто крыху больш за 200. Ці трэба казаць, што за такія грошы яны ледзь зводзяць канцы з канцамі, і таму павінны працаваць і цяпер на сваіх падвор'ях.

Яшчэ некалькі гадоў таму амаль у кожным двары трымалі карову, а хто і па дзве. Цяпер карова засталася толькі ў Ірыны Загдай. Жанчыне ўжо за семдзесят гадоў, а яна сама і косіць, і возіць, і праз дзень пасе ў полі, бо ва ўсёй ваколіцы засталося ўсяго дзве рагулі: у яе ды яшчэ ў пенсіянеркі Соф'і Андрукевіч з вуліцы Гагарына.

Усе жыхары завулка Фогеля трымаюць хатнюю птушку, а хто і пару парасят. Як, напрыклад, Марыя Райдзюк. У Марыі Аляксандраўны вельмі хворыя ногі, яна з цяжкасцю ходзіць, але з раніцы да змяркання тупае і тупае па гаспадарцы. Двое старэйшых унукаў вучацца на платным аддзяленні, і жанчына з усіх сіл стараецца дапамагчы сыну і нявестцы ўсім, чым толькі можа. Ды і малодшаму сыну, у якога таксама двое дзетак, не лішняя матуліна дапамога.

Насупраць Марыі Аляксандраўны жыве Зінаіда Каско, або як яе ўсе тут называюць — баба Зіна. Кабета мае 82 гады.

Баба Зіна рана засталася ўдавой. Муж пакінуў яе з двума дзецьмі на руках. Дачка Валя то ўжо крыху падрасла да таго часу, а сын Ванечка быў зусім дзіця горкае. Выгадавала кабета дзяцей. Дачку замуж аддала за добрага чалавека. А з сынам здарылася вялікае няшчасце: суседскі хлопец па неасцярожнасці прастрэліў яму руку. Ды так, што кісць дактары ўратаваць не змаглі. Застаўся Ваня калекам, але навучыўся і адной рукой рабіць усялякую работу. Хоць і горкай была тая радасць, але баба Зіна радавалася, што калецтва не зламала сына, што ён мужна нёс свой крыж. Ды нядоўга. У адну з веснавых начэй Ваня нечакана памёр. Ціха, у сне, нават маме не паскардзіўся ні на які боль...

Потым хвароба скруціла саму бабу Зіну. Не тое што рабіць, хадзіць не магла. Думала, усё, не ўстане больш з пасцелі. Але Бог злітаваўся над ёю, паслаў збавенне ад цяжкай хваробы. Цяпер яна, нягледзячы на пастаянную занятасць, часта ходзіць у царкву маліцца. І жыве па божых законах: ніколі нікога не асуджае, не пакрыўдзіць чалавека ні злым словам, ні няласкавым поглядам. Дабром і спагадай свецяцца яе вочы, што выплакалі за доўгае жыццё столькі слёз...

Зінаіда Карпека мае вышэйшую адукацыю. Некалі займала добрую па раённых мерках пасаду, а цяпер, як і ўсе суседкі, пенсіянерка. Удава. Як і яны, шчыруе на сваім падвор'і. Года яшчэ няма, як збыла карову. Але па-ранейшаму трымае свіней, розную хатнюю птушку. І сабе трэба, і дзецям ды ўнукам хочацца дапамагчы.

Соф'я Герус некалі марыла аб вышэйшай адукацыі, бо ў школе вучылася вельмі добра. Але калі сказала аб гэтым бацькам, то маці стала сцяной:

— Ты што надумалася? А хто мне дапаможа калгасныя дзялкі палоць? З чатырох дзяцей Соня была малодшай, два браты і сястра ўжо мелі свае сем'і, і бацькі спадзяваліся больш на яе, чым на іх.

Аднак з тых дзялак карысці не было: работа цяжкая, а даходу ніякага. Тады ўжо бацькі адумаліся. Яны і рады былі б адпусціць з дому Соню, а старшыня калгаса не даваў даведкі на атрыманне пашпарту. Адна дарога была маладой дзяўчыне: на будоўлю цэглу цягаць. Туды з калгаса мусілі адпусціць.

Так Соня вырвалася з вёскі. Працавала на будоўлі, потым доўгія гады, аж да самой пенсіі, была старшым кантралёрам у энергазбыце.

Самой не ўдалося атрымаць вышэйшую адукацыю, але Соф'я Баляславаўна ўсё рабіла і робіць дзеля таго, каб яе дзеці і ўнукі былі адукаванымі людзьмі. Са сціплай пенсіі рубель выкраіць цяжка, дык яна кожнае лета даглядае поўны двор хатняй птушкі. У яе і куры, і індыкі, і качкі. Дзякуючы нястомнай мамінай працы і, вядома ж, свайму ўласнаму старанню старэйшая дачка Галіна закончыла кансерваторыю, працуе завучам у адным з музычных вучылішчаў. Сярэдняя Наталля, лічы, выгадаваўшы дзяцей, паступіла ў Мінскі універсітэт імя Максіма Танка. На наступны год атрымае дыплом. Малодшая Таня стала бухгалтарам. Старэйшы ўнук, сын Галіны, вучыцца на перакладчыка ў Мінскім лінгвістычным універсітэце.

Не так даўно з завулка-тупіка зрабілі прамы выезд, раскідаўшы старыя гаражы былой ветэрынарнай лячэбніцы. Гэта мне здаецца сімвалічным, бо дзеці і ўнукі насельнікаў завулка ўжо не будуць жыць так, як іхнія бацькі, бабулі і дзядулі. Яны атрымліваюць вышэйшую адукацыю, думаюць і разважаюць па-новаму. Многія былі ў краінах Заходняй Еўропы і расказалі бацькам, што савецкі лад жыцця, які ў нас так хвалілі на ўсіх скрыжаваннях, у цывілізаваных людзей у лепшым выпадку выклікае горкую ўсмешку. Яны ўжо ведаюць, што чалавек мае права на ўласную думку, на годнае жыццё. А яшчэ, вярнуўшыся з-за мяжы, расказваюць, што там людзі сталага веку, атрымаўшы пенсію, не маюць патрэбы траціць сілы на тое, каб гадаваць хатнюю жывёлу ды птушку, да сёмага поту шчыраваць на агародах. Яны, маўляў, падарожнічаюць па розных краінах, адпачываюць у пэўным сэнсе слова. У іх хапае на гэта грошай, бо дзяржава па-сапраўднаму клапоціцца аб сваіх грамадзянах. І пажылых, і маладых.

Але некаторым старым з завулка Фогеля гэта не вельмі зразумела, бо яны прывыклі ўсё жыццё хадзіць пад бізуном, рабіць тое, што скажуць, і думаць так, як скажуць. І ніякага дзіва няма, што многае з таго, аб чым гавораць маладыя, да іх, так бы мовіць, не даходзіць.

— О, цяпер жыць добра, — кажа адна васьмідзесяцігадовая бабуля, якая атрымлівае крышку больш за дзвесце тысяч рублёў пенсіі і есць, як сама казала, малако, тварог ды батон.

— Некалі я са сваёй вёскі ў Дзятлава за дзевяць кіламетраў босая хадзіла, бо абуць не было чаго. А цяпер маю і боты, і туфлі, і тапкі...

— І гумовыя галошы, — хітра прыжмурыўшы вочы, падказвае малая праўнучка.

Разумныя людзі ва ўсёй краіне шукаюць выйсце з тупіка. І знойдуць, бо час цяпер такі, што нельга жыць па-ранейшаму. Мы знаходзімся ў цэнтры Еўропы, а не на якім-небудзь закінутым востраве.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
14 САКАВІКА 2008 г.

События в мире: европейский взгляд

Сапатеро «получил» второй срок

Правящая Социалистическая рабочая партия Испании победила на парламентских выборах. Их итоги означают для левых, что их приход к власти 4 года назад не был случайным успехом. Но лидеру социалистов Сапатеро не удастся сформировать однопартийный Кабинет министров, потому что абсолютного большинства в нижней палате парламента его партия так и не добилась.

Они получают в Конгрессе депутатов, нижней палате испанского парламента, 169 из 350 мест. Народная партия заработала 154 мандата против 148 в конгрессе нынешнего созыва. Партия умеренных каталонских националистов "Конвергенция и Единство" сохранила свои 10 мандатов. Остальные мелкие партии ослабили свои позиции в законодательном органе страны: "Баскская националистическая партия" получила 6 мест, "Левые республиканцы Каталонии" — 3, Объединенные левые — 2 мандата вместо нынешних 5.

Лидер социалистов получает свой второй мандат главы кабинета министров в условиях куда более тяжелой экономической ситуации, чем еще 7 месяцев назад. Рост ВВП на 2008 год запланирован на уровне 2% — год назад это было 3,8%. Уровень безработицы, недавно находившийся на минимальной отметке за 30 лет, снова растет. Инфляция достигает 4,4%.

Тем не менее бюджетный профицит составляет 20 миллиардов евро — невиданное для

Испании явление за последние 30 лет. В случае необходимости этот буфер позволит профинансировать план по перезапуску экономического роста.

Чтобы "перезапустить" экономический рост, кандидат в премьеры от социалистов обещал провести в жизнь масштабный проект возведения социального жилья — 150 тысяч квартир. Строительство должно создать множество рабочих мест и снизить уровень безработицы. Малообеспеченные семьи, которые испытывают проблемы с выплатой жилищных кредитов, получат налоговые льготы и продление срока кредита за счет государства.

Еще одна неотложная проблема — взаимоотношения центрального правительства Испании с органами власти автономных регионов, которые не прекращают бороться за расширение своих полномочий. В особенности это актуально для Страны Басков, где региональное правительство объявило референдум о праве на самоопределение.

Сапатеро обещает провести три конференции глав региональных правительств. В ходе дебатов он объяснил государственную философию, которой собирается руководствоваться. "Я являюсь приверженцем защиты мира, международного права, я приверженец единой, европейской Испании, живущей в гармонии и уважающей свое многообразие", — передает Euronews слова Сапатеро.

Джордж Буш спел для журналистов

Президент США Джордж Буш исполнил шуточную песню в стиле кантри, выступая на ежегодном ужине для ведущих вашингтонских журналистов, сообщает Рейтер.

Надев ковбойскую шляпу, президент перепел известный стандарт "Green Green Grass of Home", полностью изменив в нем слова. В частности, в песне рассказывалось о том, что скоро восьмилетний срок президентства Буша окончится и он наконец сможет вернуться к себе на ранчо в Техас, где его ждут мама, папа и собака Барни. В песне также упоминались госсекретарь Кондолиза Райс и вице-президент Дик Чейни, решающие все проблемы Белого дома, пока Буш мечтает о поездке на ранчо.

Как отмечает агентство, американский лидер, впервые публично исполнивший песню, практически не сфальшивил и после удостоился "стоячей" овации от журналистов.

Ежегодный ужин в Gridiron Club — старейшей и самой престижной организации столичных журналистов — традиционно сопровождается шуточными выступлениями первого лица государства.

Белградский кризис

Правительство Сербии приняло решение о проведении в стране досрочных парламентских выборов и ушло в отставку. Его премьер-министр Воислав Коштуница при этом заметил: "Правительство больше не имело единой политики относительно будущего страны конкретно по вопросу Косово и Метохии в составе Сербии. Такое правительство не в состоянии функционировать".

Суть спора заключается в том, что представители Демократической партии Сербии (лидер — премьер-министр Воислав Коштуница) и "Новой Сербии" (лидер — министр инфраструктуры Велимир Илич) настаивают на невозможности дальнейшей интеграции страны в Евросоюз, если Брюссель намерен и дальше воспринимать Сербию без Косово в ее составе, как это происходит сейчас.

Демократическая партия (лидер — президент Сербии Борис Тадич) и партия "Группа 17 плюс" (лидер — министр экономики и регионального развития Младжан Динкич) заявляют о том, что Сербии необходимо двигаться в сторону Европы, при этом вопрос сохранения Косово должен решаться в другой плоскости.

Сербское общество также сильно поляризовано. Последние президентские выборы 3 февраля, на которых демократ Тадич победил радикала Николича с небольшим преимуществом, казалось бы, показали стремление большей части населения сблизиться с Евросоюзом. Однако спустя две недели 17 февраля парламент Косово в одностороннем порядке провозгласил независимость, и в об-

ществе произошел подъем патриотических настроений.

Кроме того, в промежутке между победой Тадича и принятием Косово независимости Брюссель предложил Белграду подписать специальный договор о сближении, в котором содержалась явная предпосылка к скорому вступлению Сербии в Евросоюз. При этом ЕС параллельно вел активную подготовку своей миротворческой миссии для Косово, которую в Белграде считают незаконной.

Коштуница, выступающий за решение проблемы евроинтеграции исключительно с связке с вопросом сохранения Косово, назвал такое предложение Брюсселя "обманом", сообщает РИА Новости.

Таким образом, проевропейские партии, имеющие большинство в кабинете министров, при поддержке президента Тадича видят будущее Сербии только в составе Европейского Союза. А Коштуница, который заручился поддержкой националистов, настаивает на том, чтобы Сербия прекратила процесс сближения с Евросоюзом до тех пор, пока Брюссель не отменит решение о признании независимости Косово.

Белградские аналитики считают, что досрочные парламентские выборы — это лучший выход из политического кризиса в Сербии, замечает Радио Свобода.

«Скорая помощь» ООН

В ООН создана группа специалистов быстрого реагирования, которые займутся урегулированием кризисов в различных точках мира. В ее состав входят шесть экспертов в области безопасности, конституционного права и прав человека, отобранные из 400 соискателей, сообщает Associated Press.

Группа будет выезжать на место возникновения кризиса по просьбе заинтересованных государств или международных организаций. По словам заместителя генерального секретаря ООН по политическим вопросам Линна Пэскоу, речь идет о ситуациях, когда необходима срочная помощь, как это произошло в Кении, где после президентских выборов начались массовые беспорядки.

Пэскоу отметил, что два члена команды — специалист по конституционному праву и эксперт по вопросам безопасности — уже находятся в Кении. Среди других точек мира, где может потребоваться срочная помощь, Пэскоу упомянул Сомали, Ирак и Кипр.

Команду экспертов возглавляет американка Джойс Нью, специализирующаяся на разрешении конфликтов. Она работала исполнительным директором Института по проблемам мира и справедливости при университете Сан-Диего. Нью принимала участие в выработке решений по кризисам в Албании, Боснии и Герцеговине, Республике Конго, Эстонии, Грузии, Абхазии, Мадагаскаре, Мали, Судане и Уганде.

По мнению Пэскоу, группа экспертов очень востребована и будет проводить до 80 процентов времени в разъездах. Финансирование работы специалистов на ближайший год взяло на себя правительство Норвегии.

Маленький, но великий,

или Кто самый маленький правитель в мире?

Совсем недавно было очевидно, кому принадлежит этот титул: при росте 162 см его однозначно удерживал Ким Чен Ир — "великий руководитель" Корейской народно-демократической республики. Избрание Дмитрия Медведева президентом России изменило положение, пишет немецкая Suddeutsce Zeitung. Рост Медведева от макушки до пяток — 162 см, и потому вопрос становится открытым. (По официальным данным, Путин на целых 8 см выше; журналисты стараются снимать Медведева снизу, а в окружении других людей советуют ему выступать на шаг вперед.)

Он такой не первый. Рост Ленина был 164 см, Сталина — лишь на сантиметр больше, Пушкина — 166 см, космонавта Юрия Гагарина — всего 157 см, что, впрочем, ввиду малого пространства внутри ракеты оказалось весьма практичным.

После распада Советского Союза правители России уменьшаются с каждым президентским сроком: начиная с Бориса Ельцина (189 см) до Владимира Путина (170 см) — к Медведеву.

Британская Guardian добавляет, что вышеперечисленные просто великаны в сравнении с другими. Самым низким из известных мировых лидеров был Бенито Хуарес, пять раз занимавший пост президента Мексики (с 1867-го по 1872 год) — его рост составлял 135 сантиметров. Энгельберт Дольфус, австрийский канцлер 1932-1934 годов, был ростом 148 см. Давид Бен-Гурион, первый премьер-министр Израиля, имел рост 150 см, так же как Дэн Сяопин, фактический лидер Китая в 1980-е годы. Ясир Арафат возвышался над миром на 155 см, Никита Хрущев — на 158, а Хайли Селасси — на 160.

ФОТОВЗГЛЯД

Президент Аргентины Кристина Киршнер проводит смотр почетного караула во время визита в Венесуэлу.

Женщины: стабилизация опасного мира

Роль женщин в обеспечении мира и безопасности становится все более признанным фактом, о чем в первую очередь свидетельствует Резолюция №1325 о женщинах, мире и безопасности, принятая Советом Безопасности ООН, хотя еще многое нужно сделать на всех уровнях для полного выполнения данной резолюции. В преддверии Международного женского дня в Брюсселе встретились более 50 женщин-лидеров из разных стран мира для обсуждения роли женщин в стабилизации небезопасного мира.

Сейчас, весной 2008 года, когда мы пишем это обращение, нам сложно представить мир, где нет войны. Ежедневно мы слышим сообщения о новых конфликтах, постоянно возрастающем напряжении и насилии. И какой бы опасной ни была возникшая ситуация — от войны до угрозы здоровью человека и климатических изменений — в первую очередь непомерно страдают женщины, традиционно занимающие в обществе наиболее уязвимую позицию.

80 процентов беженцев в мире составляют женщины и дети. Сексуальное насилие и изнасилования превалируют именно в тех регионах, где идет война, а также в лагерях для беженцев. И пока мы не признаем существование этой ужасающей реальности, мы не можем говорить о роли женщины в урегулировании конфликтов. В то же время, мы не должны забывать тот факт, что женщины также играют ключевую роль в обеспечении мира и стабильности. Без участия женщин не может происходить ни эффективного обсуждения вопросов безопасности, ни прогресса в решении этих вопросов. Участие женщины является решающим фактором не только в таких традиционно более "жестких" сферах обеспечения безопасности, как военные действия, построение мира, послевоенная реконструкция и противодействие терроризму, но и в более "мягких" угрозах жизни человека, таких как глобальные эпидемии, психологическое состояние людей во время и после войны, а также климатические изменения и ухудшение состояния окружающей среды, вызывающие серьезные опасения.

6 марта по инициативе комиссара Ферреро-Вальднер состоялась встреча с участием 50 женщин-лидеров для обсуждения вопроса на тему "Женщины: стабилизация небезопасного мира". Женщины — президенты, министры и руководители международных организаций, лидеры в сфере бизнеса и активисты из организаций гражданского общества обсудили два неразделимых вопроса: безопасность и полномочия женщин. Эта международная женская конференция для политических лидеров основывается на недавно принятых инициативах, в том числе на результатах встречи в Нью-Йорке, организованной в сентябре прошлого года Госсекретарем США Кондолизой Райс, и саммита по вопросам глобальной безопасности женщин-лидеров, состоявшегося в ноябре прошлого года и инициированного Советом женщин-лидеров мира, в котором вице-президент Комиссии Марго Вальстрём возглавляет министерскую инициативу.

На наш взгляд, ключевым фактором, способствующим стабилизации мира, является стабильное развитие. Речь идет о стабилизации опасного мира и определении правильного сочетания экономического роста и социального прогресса и, в то же время, о заботливом отношении к нашей планете.

Без образования невозможно достичь социальной стабильности. Однако на сегодня около 100 миллионов детей не получают никакого образования, причем 70 миллионов из них — девочки. Мы должны изменить эту ситуацию.

Еще одним важным инструментом стабилизации мира является Резолюция ООН №1325 о роли женщин в обеспечении мира и безопасности, которая проводит связь между гендерным равенством и мировой безопасностью, а также признает значение голоса женщин в создании прочного мира. Данная резолюция является вехой на пути к мирным процессам и политике безопасности, характеризующимся повышенной гендерной чувствительностью. Хотя выполнение упомянутой резолюции представляет собой долгосрочный политический процесс, оно должно стать предметом повышенного внимания в целом в ЕС и различных странах-членах, в частности, со стороны лиц, принимающих решения в сфере внешней, оборонной политики, политики безопасности и развития. После принятия резолюции в 2000 г. наблюдается повышение уровня осознания того значения, которое имеет вовлечение женщин в мирный процесс и процесс восстановления. Однако выполнение предусмотренных резолюцией задач носит спорадический и произвольный характер.

Женщины делают наш мир лучше — отчасти потому, что они используют более всеохватывающий подход к вопросам безопасности и реагируют на основные социально-экономические проблемы, которые в противном случае были бы проигнорированы. Благодаря женщинам, мирные соглашения и предпринимаемые по окончании конфликтов действия становятся более жизнеспособными, эффективными и практичными, поскольку предусматривают широкий комплекс мероприятий, включая, в частности, участие в мирных переговорах; реабилитацию детей, связанных с вооруженными группировками, приглашение участников конфликта к обсуждению общих проблем, таких как, например, обеспечение доступа к чистой воде и поддержка бюджетных ассигнований, направленных в первую очередь на финансирование системы социального обеспечения, нежели военных расходов.

Женщины также могут внести большой вклад в планирование и выполнение программ изъятия оружия, демобилизации и реинтеграции. На уровне сообщества женские организации принимают активное участие в инициативах по разоружению и реинтеграции. Путем убеждения воинствующих сторон сложить оружие, изъятия оружия либо предоставления психологически-социальной помощи бывшим боевикам такие женские организации гражданского общества, как ProPaz (Мозамбик) или Dushirehamwe (Бурунди) стремятся предотвратить распространение ручного огнестрельного оружия, а также решить вопросы, касающиеся последствий, с которыми сталкиваются бывшие боевики, и их потребностей.

Однако, несмотря на общий консенсус относительно защиты женщин и расширения их полномочий, женщины остаются на обочине процессов принятия решений, обеспечения мира и проведения миротворческих операций. Представительство женщин в политике остается на низком уровне во всем мире, в том числе и в Европе. В мире только шесть процентов министров и десять процентов членов парламента — женщины. И все мы знаем, что "стеклянный потолок" остается на прежнем месте — будь то политика или экономика.

Ограничение участия женщин в принятии решений на всех уровнях создает значительные препятствия в достижении целей, предусмотренных Резолюцией №1325. Также распространена проблема, заключающаяся в том, что женщин рассматривают как жертвы, не признавая их потенциала как активных участников процесса создания более стабильного и безопасного мира.

Бенита ФЕРРЕРО-ВАЛЬДНЕР,
член Европейской комиссии по вопросам внешних отношений и Европейской политики соседства;
Марго ВАЛЬСТРЁМ,
вице-президент Европейской комиссии по институциональным связям и коммуникации.

КАЛЕЙДОСКОП

Дорогой особняк в Лондоне

Установлен новый рекорд по продаже недвижимости в Лондоне, сообщает британская газета The Evening Standart.

Единственная дочь экс-президента Украины Леонида Кучмы и супруга Виктора Пинчука — крупнейшего украинского олигарха — Елена Франчук купила викторианский особняк в Лондоне за рекордную цену — 80 миллионов фунтов стерлингов (159 миллионов долларов).

Этот пятиэтажный дом находится в одном из наиболее престижных районов Лондона — Кенсингтоне. В нем десять спален, подземный бассейн, тренажерный зал, сауна, кинотеатр и специальная безопасная комната-убежище.

Черный чай помогает

Употребление черного чая помогает предупредить развитие диабета. Это установили ученые из Шотландского университета.

Содержащиеся в черном чае активные полифенолы способны выполнять роль инсулина, который необходим человеку, страдающему диабетом. Особенно эффективен чай против диабета II группы, риск заболевания которым увеличивается с возрастом.

Однако врачи предупреждают, что настоящий инсулин не стоит заменять потреблением большого количества чая. "Мы только находимся в начальной фазе работ по созданию альтернативного способа лечения диабета", — подчеркнул один из ученых, передает ИТАР-ТАСС.

Телефон «Бамбу»

Голландский дизайнер Герт-Ян ван Брюгель представил концепт самого экологичного телефона "Бамбу". Его корпус выполнен из бамбука и биопластика, которые разлагаются в почве. Иными словами, гаджет способен на самоутилизацию.

Примечательно и то, что в телефон встроены семена бамбука, передает НТВ. Каждый выброшенный экземпляр может породить целую бамбуковую плантацию. Немаловажная деталь: необычный аппарат заряжается вручную.

Рай не обнаружен

13-летняя француженка отправила своей умершей маме послание в рай. Написав на конверте имя и фамилию умершей матери и адрес — "Райская улица на Небе", девочка бросила письмо в почтовый ящик. Однако через несколько дней письмо вернулось обратно с пометкой "Адресат не обнаружен".

К письму прилагалось требование оплатить почтовый сбор в размере 1,35 евро. Когда приемная мать 13-летней Анаис упрекнула работников почты в бездушии, те ответили, что всего-навсего "выполняли свою работу".

Оказалось, что в департаменте Сена-и-Луара на самом деле существует населенный пункт под названием Небо, вот только Райской улицы там нет. Потому-то почтовая служба после безуспешных поисков адресата и вернула письмо отправителю, не забыв потребовать оплатить положенный сбор.

Трехзвездные рестораны

Германия заняла второе место в Европе по количеству ресторанов, удостоенных трех звезд в рейтинге ресторанного путеводителя Michelin — одного из самых авторитетных изданий в ресторанном бизнесе.

По количеству ресторанов с тремя "мишленовскими" звездами Германия обогнала Италию (5), Испанию (6) и Японию (8 трехзвездочных ресторанов), уступив первенство лишь мировому кулинарному лидеру — Франции, где, согласно рейтингу Michelin, находится 25 таких ресторанов.

В США и Великобритании эксперты Michelin насчитали по четыре трехзвездочных ресторана, в Швеции, Голландии и Бельгии — по два, и еще один был найден в княжестве Монако. В других странах мира, в том числе в России, рестораны такого уровня пока не обнаружены.

Народная Воля http://www.nv-online.info
14 САКАВІКА 2008 г.

ПРЫВАТНАЕ ЖЫЦЦЁ

Лявон БАРШЧЭЎСКІ:

«Калі што здарыцца, то на пенсію не выжыву...»

Старшыня Партыі БНФ Лявон Баршчэўскі вельмі рэдка п'е віно і наведвае рэстараны. Чалавек, які бегла размаўляе на сямі мовах, проста не можа сабе гэтага дазволіць. Прычына банальная — адсутнасць грошай... "Народная воля" пабывала ў гасцях у Лявона Пятровіча.

Цяснота — не крывота

Лявон Баршчэўскі прызначыў сустрэчу на палову дзевятай раніцы.

"У мяне якраз няма першай пары, таму чакаю вас з самага ранку", — сказаў ён.

Наш візіт Баршчэўскі вырашыў не анансаваць жонцы.

"А то б сказала, што трэба абавязкова прыбрацца да прыходу гасцей", — усміхнуўся ён.

Старшыня Партыі БНФ жыве ў звычайнай хрушчоўцы на вуліцы Гая ў Мінску. Кватэра — двухпакаёвая. Прыхожая настолькі маленькая, што ўдваіх распрануцца і зняць боты там даволі складана.

"Раней мы жылі яшчэ ў горшых умовах, — пачынае экскурсію Лявон Пятровіч. — *Гэтая кватэра належала цешчы, а мы жылі ў суседнім пад'ездзе — у нас там пакой у двухпакаёвай камуналцы. За адзін пакой мы плацілі суседу, які тады жыў у другім месцы. (Калі хочаце, я вас пазней туды адвяду.) Потым пераехалі сюды. Плошча пярэдняй сапраўды вельмі маленькая — калі цешча памерла, труну з целам прыйшлося выносіць стоячы...*

Зала ў нас, напэўна, 18 квадратных метраў, а дзіцячы пакой прыблізна 12, кухня — каля 6. Але нам на траіх гэтай прасторы быццам бы хапае. Дзве старэйшыя дачкі ад майго першага шлюбу цяпер жывуць разам у матчынай кватэры (раней адна дачка разам з мужам здымала кватэру, а цяпер яны разышліся). А мая былая жонка з'ехала за мяжу, пасля таго, як другі раз выйшла замуж.

Вось гэтыя шафы-купэ ў пакоі дачкі мы зрабілі сёлета. Як бачыце, тут у асноўным кнігі, але далёка не ўсе — частка захоўваецца ў бацькоўскай хаце ў Полацку, дзе жыве мой брат.

Рамонт мы рабілі ў тры этапы, паколькі адразу на ўсё грошай не было. Спачатку крыху аднавілі кухню, бо яна была вельмі страшная, паклеілі сцены. Яшчэ першым заходам паклалі ламінат. Тры гады таму паставілі шклопакеты..."

Лявон Баршчэўскі падтрымлівае беларускіх вытворцаў.

"Новыя канапу і крэсла вытворчасці "Пінскдрэў" купілі два месяцы таму, — распавядае Лявон Пятровіч. — *Жонка прымусіла, бо на старую канапу глядзець ужо было немагчыма...Тэлевізар, як бачыце, самы звычайны "Гарызонт" — куплялі па аб'яве. На кухні стаіць маленькі плоскаэкранны польскі. Яго нават можна выкарыстоўваць як манітор да камп'ютэра".*

Дарэчы, дзверы на кухню ў Баршчэўскіх адсутнічаюць.

"Мы іх проста знялі, таму што яны скрадаюць прастору", — гаворыць старшыня БНФ.

Абедзеннага стала на кухні ўвогуле няма — яго там проста няма куды ставіць. Стол-кніга стаіць на мяжы кухні, прыхожай і залы.

З каштоўных рэчаў на кухні — стары драўляны сервант.

"Жонка не хоча яго выкідваць, сказала, што лепей нойме майстра, які яго адрэстаўруе, — кажа ганаровы старшыня Беларускага ПЭН-Цэнтра. — *Мікрахвалёўку "Самсунг" набылі ў Ждановічах. Двухкамерны халадзільнік "Атлант", можна сказаць, куплялі па блату. У суседнім пад'ездзе жыве супрацоўніца завода "Атлант", якая гадоў сем таму атрымлівала заробак халадзільнікамі. Яна прапанавала нам купіць яго без нацэнкі, па заводскай цане.*

Суседзі зверху нас увесь час заліваюць — у іх там нейкая труба забіваецца. Таму мы паклалі на столь пластык. Што там над пластыкавай столлю робіцца, нават уявіць не магу...

Праўда, тут у мяне суседзі яшчэ нармальныя. А калі мы жылі ў камуналцы, то людзі нават не хавалі, што за бутэльку "чарніла" лёгка здавалі мяне ўчастковаму міліцыянеру. А потым казалі: "Ну, прабач, трэба ж было выпіць..."

Планавалася, што наш дом будуць рамантаваць з адсяленнем. Але потым, відаць, перадумалі. Сказалі, што ў 2007 годзе плануецца рабіць капітальны рамонт ужо без адсялення. Але ўжо 2008 год, а рамонтам нават і не патыхае..."

Ні машыны, ні дачы ў літаратара і палітыка Баршчэўскага няма.

"Патрыманую машыну я мог бы набыць, а вось гараж побач з домам, напэўна, не раздабуду, — кажа бэнээфавец са стажам. — *А ў маім стане проста пад вокнамі машыну пакідаць — гэта больш праблем будзе.*

Пакуль паспяваю паўсюль на грамадскім транспарце. Але калі ўжо вельмі трэба некуды, то ў партыі ёсць людзі з аўто — калі трэба, яны дапамагаюць.

Што тычыцца лецішча, то ў Вярхоўным Савеце12-га склікання была мажлівасць атрымаць і зямельны ўчастак, і кватэру. Аднак тады ж усяго баяліся — не дай бог напішуць пра гэта! Я нічога не ўзяў. І не шкадую, бо на лецішча ўсё роўна часу няма, а ім трэба займацца..."

Самае вялікае багацце Лявона Баршчэўскага — кнігі.

Так выглядае хрушчоўка, дзе жыве старшыня Партыі БНФ.

Пакой дачкі.

Зала.

Кухня вельмі маленькая.

Касцюм не ад "Армані".

Багаты не ведае, чым бедны абедае

Кандыдат філалагічных навук Лявон Баршчэўскі, як і большасць звычайных беларусаў, шукае, дзе танней набыць прадукты.

"Як правіла, па магазінах вандрую жонка, — гаворыць ён. — Ну *і я часам заходжу, бульбу цягаю. У нас тут побач дзве крамы. Але часцей за ўсё ходзім на Камароўку — там танней, а ў нас лішніх грошай няма".*

На кухні заўважаю недапітую бутэльку нятаннага віскі "Джон Лі".

"Гэта падарунак — дыпламаты замежныя прысылаюць да Новага года ці яшчэ да якога свята, — тлумачыць гаспадар. — *Я не аматар віскі. І сам бы яго ніколі не купіў. Я лепш джын з тонікам вып'ю. Ці гарэлкі. Дарэчы, гарэлку купляў у "дзыюці фры" — звычайна браў "Фінляндыю", яна там каштавала прыблізна столькі, колькі тут наша. Віно набываем толькі па вялікіх святах — дарагавата абыходзіцца. Таму піва п'ю. Вось зараз ужываю "Сябар. Самабытнае". Нейкі час было вельмі добрае"Крыніца Прэміюм". А цяпер яго, на мой погляд, у рот не ўзяць. Пакуль новая марка — яно нармальнае месяцы тры, а потым становіцца, як усе астатнія. А вось, напрыклад, замежнае "ZHYWIEC" як было смачным гадоў 20 таму, такім сёння і засталося..."*

У халадзільніку ў Лявона Баршчэўскага самы звычайны прадуктовы набор. Маянэз "Махеев", малако, смятана, яйкі, кансерваваныя магазінныя гуркі, сыр.

"Мы пазаўчора адзначалі мой юбілей, дык штосьці яшчэ засталося з барскага стала, — кажа Лявон Пятровіч, адкрываючы халадзільнік. — *Прадукты для гасцей, якія прыедуць павіншаваць з юбілеем, не закуплялі. Вырашылі, што павядзём іх у кавярню "Каляда", што недалёка ад дома. А ўвогуле мы па рэстаранах не ходзім — не выходзіць па грашах...*

У чым сабе не адмаўляем, дык гэта ў добрай каве. Мы любім гэты напой. Дарэмна вы адмовіліся, я са Швецыі прывёз вельмі смачную..."

Рубель з граша паходзіць

Лявон Баршчэўскі не хавае, што ў яго няма пастаянных даходаў.

"Я зарабляю на жыццё літаратурнай працай, — гаворыць ён. — *Напрыклад, зрабіў слоўнік, пераклаў фільм, выдаў кніжку — атрымаў ганарар. У Беларускім народным фронце я пакуль нічога не зарабіў — наадварот, яшчэ ўклаў свае грошы, бо трэба было за нешта там расплаціцца. Вось зараз атрымаў ганарар за слоўнік, але яго ўвесь прыйдзецца пусціць на святкаванне юбілею. Толькі на гэта і хопіць. А далей трэба думаць, дзе браць грошы... На жаль, замежныя ўстановы на партыі грошы не даюць. Хто прымацаваны да недзяржаўных арганізацый ды нейкіх праваабарончых структур, той, магчыма, нешта атрымлівае. А такія, як я, — не.*

І я, і жонка выкладаем у ліквідаваным уладамі недзяржаўным Беларускім гуманітарным ліцэі. Але заробку там не атрымліваем.

У мінулым годзе я лічыўся работнікам адной фірмы, але там таксама плацілі невялікія грошы...У пенсійны фонд мы нічога не зарабляем, і гэта мяне клапоціць больш за ўсё. У апазіцыі сапраўды ёсць людзі, якія афіцыйна ні дня нідзе не працавалі. Якая ў іх будзе пенсія? На што яны разлічваюць?..

Я зараз жыву лепш, чым за савецкім часам. Адзінае, што няма магчымасці працаваць па спецыяльнасці і зарабляць так, як мог бы. Прыходзіцца многа работы выконваць бясплатна — камусьці ж трэба гэта рабіць... Мы зараз жывыя, здаровыя. А калі нешта здарыцца, то... На пенсію хутчэй за ўсё не выжывем..."

Нягледзячы на тое, што стабільнага заробку не мае, Лявон Бяршчэўскі мусіў падаць дэкларацыю аб даходах, бо ў мінулым годзе ён атрымліваў грошы з-за мяжы.

"Да той сумы, якую можна не дэкларываць, я не дацягваў прыблізна тысяч трыста, — гаворыць Баршчэўскі. — *Але ў Польшчы выходзілі мае кнігі. Я там плаціў падаткі і тут мусіў пра гэта засведчыць. Прынёс у падатковую інспекцыю адпаведны дакумент на польскай мове, а яны кажуць: мы нічога не разумеем. Прыйшлося заплаціць 60 еўра, каб заверылі пераклад! Гэта проста анекдот!.."*

Апазіцыйны палітык не хавае, што яму прыходзіцца лічыць грошы.

"У нас заўсёды ёсць недатыкальны запас — прыблізна каля тысячы ўмоўных адзінак (мала што можа здарыцца), — адкрывае сямейныя таямніцы Лявон Пятровіч. — *І калі да яго падбіраемся, адразу скарачаем свае выдаткі і траўм па мінімуму. У сярэднім у месяц проста на жыццё вылятае прыблізна 350 долараў. Гэта разам з камунальнымі плацяжамі, грамадскім транспартам, ежай".*

Па адзенні сустракаюць

Нядаўна Лявон Пятровіч купіў сабе новы касцюм. На маё пытанне "Відаць, ад "Армані"?" Баршчэўскі на поўным сур'ёзе адказаў: *"У мяне амаль уся вопратка беларуская, таму я нават не ведаю, што гэта за фірма. Зараз паглядзім. Па-мойму, мінскай вытворчасці. Бачыце — ярлык "Рэспект". Каштаваў дзесьці 180 тысяч. Яшчэ разам з ім у ЦУМе набыў гальштук — за 30 тысяч. Скажу шчыра: за апошнія пяць гадоў гэта мой першы гальштук. У мяне былі, але вельмі просценькія. Я калі перайшоў у пісьменнікі, адразу змяніў імідж і доўгі час хадзіў без гальштука. А зараз вось патрэбны касцюм..."*

На 50-годдзе дочкі падаравалі Лявону Пятровічу новы мабільны тэлефон.

"Я пакуль аддаў яго малодшай дачцэ, — кажа Лявон Пятровіч. — *Гэтыя дзеці — я нават здзіўляюся — чых-чых і без усялякай інструкцыі ўсё знаюць! Мне месяц патрэбны, каб з тым тэлефонам разабрацца, а ім — усяго некалькі хвілін.*

Ноўтбук не мой уласны — ён у мяне ў часовым карыстанні. Вось гэты камп'ютэр мой, але я яго не набываў — сабралі сябры. Інтэрнэт дахаты толькі днямі падвялі — колькі за яго трэба будзе плаціць, яшчэ не ведаю".

Паводле слоў Баршчэўскага, дзеці ніколі не папракалі яго, што ён не можа набыць ім, напрыклад, супермодныя і супердарагія боты альбо вопратку.

"У мяне, дзякуй богу, яны выхаваны ў такім спартанскім духу, — кажа ён. — *Старэйшая дачка — філолаг. Я ганаруся ёй — яна выдала некалькі арфаграфічных слоўнікаў. Зараз працуе ў нейкай астралагічнай фірме, ходзіць на начныя змены. Работа ў псіхалагічным сэнсе цяжкая. Але зарабляе больш-менш прыстойна".*

Праўда, лёс па зорках яна бацьку не прадказвае.

"Звычайна родзічам не робяць прагнозы — не атрымліваецца, — распавядае Лявон Пятровіч. — *У мяне ёсць іншы астролаг. Хаця, па шчырасці, я ў меру скептычна стаўлюся да такіх рэчаў. Мне на 2010 год наваражылі эміграцыю — з жахам пра гэта думаю. Спадзяюся, што прадказанне не здзейсніцца..."*

Пазычыць 14 тысяч долараў не было ў каго

Пакуль ідзём да суседняга пад'езда, каб паглядзець на пакой Баршчэўскіх у камуналцы, Лявон Пятровіч распавядае: *"Мы нават не можам гэты пакойчык здаць у арэнду, бо, згодна з дзеючым Жыллёвым кодэксам, патрэбна згода суседзяў. А яны не даюць яе, бо ім добра жыць адным. А прадаваць пакой мы таксама не хочам — дачка расце, мала што".*

Некалькі гадоў таму была магчымасць набыць і другі пакой у камуналцы, аднак тады Лявон Пятровіч не змог знайсці грошы.

"Сусед прадаваў свой пакой за 14 тысяч долараў, — узгадвае Баршчэўскі. — *Цяпер ён, канешне, каштуе значна больш. Але на той час так атрымалася, што нават пазычыць не было ў каго такія грошы. А калі б мы тады знайшлі сродкі, у нас зараз было б дзве кватэры...*

Дарэчы, і гэты пакой, і кватэра зарэгістраваныя на жонку. У мяне ўвогуле нічога няма. Калі раптам выгане, пайду да дочак жыць. Гэта я жартую, мы добра жывём, у нас ніколі канфліктаў не было..."

Філасофія жыцця

Высокапастаўленыя чыноўнікі з заўзятай апантанасцю час ад часу паўтараюць з тэлеэкрана: маўляў, беларуская апазіцыя купаецца ў раскошы. Лявон Баршчэўскі перакананы: гэты міф трэба развіваць.

"Але для гэтага трэба мець адэкватныя сродкі — выхад на тэлеэкраны, — выказвае ён сваё меркаванне. — *Нават калі мы "Народную волю" аддрукуем чатырохмільённым накладам і раніцай распаўсюдзім, то ўвечары людзям на БТ нагавораць такога!.. Але разбіваць міфы трэба. Трэба, каб людзі сапраўды маглі параўноўваць, як жывуць дзяржаўныя чыноўнікі і як — прадстаўнікі дэмакратычнага руху. І тады б не страшна было жыць. А калі існуе толькі аднабаковая інфармацыя, то з любой мухі можна раздзьмуць слана. І таму апазіцыйны палітык павінен сябе стрымліваць...*

Я нармальна стаўлюся да багатых людзей, ніколі ім не зайздрошчу. Лічу, што людзі, якія рызыкуюць жыццём, павінны жыць лепш. Нармальна жыць. І калі з імі не дай бог нешта здарыцца, каб іх сем'і не засталіся на вуліцы і не былі галоднымі..."

Марына КОКТЫШ.
Фота Юрыя ДЗЯДЗІНКІНА.

На месяц раней, чым звычайна

На рэках Беларусі надыходзіць пік паводкі, якая сёлета пачалася на месяц раней, чым звычайна.

Пра гэта на прэс-канферэнцыі ў Мінску паведаміла начальнік аддзела гідраметэаралагічных прагнозаў дзяржаўнай установы "Рэспубліканскі гідраметэаралагічны цэнтр" Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Марына Нагібіна.

Паводле яе слоў, максімальныя ўзроўні ўздыму вады чакаюцца да сярэдзіны сакавіка. Аднак на Прыпяці ў сярэдзіне лютага прайшла зімовая паводка, і ў басейне ракі магчыма невялікае павышэнне ўзроўню вады на працягу гэтага месяца.

Як заявіла дырэктар дэпартамента па гідраметэаралогіі Мінпрыроды Марыя Гермянчук, цяперашняя веснавая паводка ў краіне прагназуецца без асаблівых катаклізмаў. Такі прагноз засноўваецца на тым, што запасы вады на вадазборы Заходняй Дзвіны, Нёмана, Дняпра, Сожа і Прыпяці даволі нязначныя, колькасць ападкаў некалькі ніжэйшая за норму, невысокая глыбіня прамярзання глебы (ад 5 да 15 сантыметраў), а таксама вялікая яе паглынальная здольнасць з-за дастаткова высокай сярэднясутачнай тэмпературы паветра.

Разам з тым, як зазначыла М.Гермянчук, на рэках Беларусі не выключана магчымасць дажджавых паводак, выкліканых павелічэннем колькасці экстрэмальных з'яў надвор'я з-за глабальнага пацяплення клімату.

Марат ГАРАВЫ.

И ТАК БЫВАЕТ

Пуля на всю жизнь

Врачи Гомельской городской центральной клинической больницы удалили из бедра жительницы областного центра немецкую пулю времен Великой Отечественной войны. Примечательно, что о существовании этого "сюрприза" сама пациентка не подозревала.

Галина Филипповна Кожушко родилась незадолго до начала войны. Во время оккупации ее родители погибли, а девочка оказалась в фашистском концлагере. При отступлении немецкие солдаты расстреляли взрослых и маленьких узников лагеря. Галине повезло: раненую, ее нашли партизаны, подлечили и передали в спецдетдом.

Прошли годы. Галина выросла, приобрела профессию, вышла замуж, родила и вырастила детей... А минувшим летом 68-летняя пенсионерка ушибла бедро, работая на дачном участке. Как рассказал корреспонденту БЕЛТА заведующий третьим хирургическим отделением Гомельской городской центральной клинической больницы Владимир Коновков, на месте ушиба образовались гематома и абсцесс, которые долго не заживали. При ультразвуковом обследовании было установлено, что в кости бедра женщины находится пуля. За 65 лет она вросла в ткани и лишь после травмы стала смещаться. Операция по ее извлечению прошла успешно.

На данный момент Галина Филипповна чувствует себя хорошо.

Покусился на чужие награды

УВД Брестской области ведет поиск злоумышленника, который, представляясь работником военкомата, похищал военные награды у ветеранов Великой Отечественной войны, сообщили "Интерфаксу" в УВД.

"В милицию обратился ряд жителей Пинска и Барановичей с заявлениями о том, что неизвестный, представившись работником райвоенкомата, похитил у них боевые награды", — рассказали в УВД.

Там уточнили, что "злоумышленник сообщал пенсионерам о том, что вышли новые документы, касающиеся увеличения выплат ветеранам, и просил их показать документы и награды". "У пенсионеров злоумышленником были похищены несколько орденов Великой Отечественной войны 1-й степени, ордена Боевого Красного Знамени, Красной Звезды, медали", — сообщили в УВД.

Там также добавили, что "есть информация, что злоумышленник посетил несколько ветеранов в Минске".

ВАС ИНТЕРЕСУЕТ...

Не путайте Великий пост с диетой

У православных начался Великий пост. Очень прошу "Народную волю" рассказать о том, каковы правила этого поста.

Лариса Васильченкова, г.Брест.

Самый длинный и строгий пост по православному календарю начался в понедельник. Православные богословы напоминают, что главными задачами этого 49-дневного периода аскезы являются усиленная молитвенная практика, покаяние в грехах и отречение от чувственной суеты. Пост — это не диета, а прежде всего духовное воздержание и затем уже воздержание в пище.

В дни поста христианину полезно отказаться от увеселительных мероприятий, курения, употребления алкоголя. Необходимо сосредоточиться на своем внутреннем состоянии и бороться с проявлениями гнева, обиды, осуждения.

